## Прэзідэнт зацвердзіў Палажэнне аб Камітэце дзяржаўнага кантролю

**Прэзідэнт Беларусі 27 лістапада падпісаў указ № 647, якім зацверджана Палажэнне аб Камітэце дзяржаўнага кантролю.**

У адпаведнасці з палажэннем Прэзідэнт ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва і кантроль за дзейнасцю камітэта. КДК са згоды кіраўніка дзяржавы можа ствараць установы і заснаваць выдавецтва і зацвярджаць іх статуты па ўзгадненні з Прэзідэнтам.

На КДК ускладзены асноўныя задачы па забеспячэнні эканамічнай бяспекі краіны, выяўленні сістэмных парушэнняў гаспадарчага і падатковага заканадаўства, адмоўных тэндэнцый у эканоміцы і сацыяльнай сферы, ажыццяўленне кантролю за прынятым мерам па дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату. Камітэту дзяржкантролю прадастаўлены паўнамоцтвы па прыняцці ў межах сваёй кампетэнцыі нарматыўных прававых актаў. Указам таксама рэгулююцца пытанні кампенсацыі кошту выпрачасці экспертыз (даследаванняў), праводзімых па рашэнні органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю, абавязковага дзяржаўнага страхавання супрацоўнікаў органаў КДК і іншыя пытанні арганізацыі дзейнасці камітэта.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Беларусь устанавіла часовы бяспошлінны ўвоз на сыравіну для сельскай гаспадаркі і нафтахіміі

У мэтах зніжэння кошту фосфарных угнаенняў, аніднай і віскознай кордных тканін, павышэння эфектыўнасці вытворчасці Прэзідэнт Беларусі сваім указам устанавіў тэрмінам на 9 месяцаў стаўку ўвазной мытнай пошліны нуль працэнтаў адносна некаторых тавараў, што ўвозяцца на мытную тэрыторыю рэспублікі.

У прыватнасці, гэта распаўсюджваецца на прыродныя фасфаты кальцыю, растваральныя сарты драўнянай цэлюлозы, ніці віскознай трывалыя нейлонавыя або з іншых поліамідаў, не расфасаваныя для рознічнага продажу, і іншыя ніці.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ...

### народную артыстку Беларусі Галіну Арлову з юбілеем

«Дзякуючы выдатнаму таленту і акцёрскаму майстэрству Вы ўнеслі вялікі ўклад у развіццё айчыннай культуры. Створаныя Вамі на сцэнах буйнейшых нацыянальных тэатраў глыбокія псіхалагічныя і праўдзівыя вобразы палюбіліся гледачам і ўвайшлі ў залаты фонд беларускага мастацтва», — гаворыцца ў віншаванні. Яркая творчая работа Галіны Арловай на радыё адзначана Дзяржаўнай прэміяй Беларусі. Прэзідэнт пажадаў артыстцы здароўя, доўгіх гадоў жыцця, натхнення, творчых поспехаў і дабрабыту.

### ...народнага мастака СССР Таіра Салахава з 80-годдзем

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў віцэ-прэзідэнта Расійскай акадэміі мастацтваў Героя Сацыялістычнай Працы народнага мастака СССР Таіра Салахава з 80-годдзем.**

«Дзякуючы непаўторнаму таленту Вы набылі вялікі аўтарытэт і прызнанне ў розных краінах. Вашы творы характарызуюцца маштабнасцю, псіхалагічнай напружанасцю і ўнутраным дынамізмам герояў», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусі шчыра цэніць добрыя адносіны Таіра Салахава да рэспублікі і аказаную дапамогу ў арганізацыі выставак выдатных майстроў мастацтва Расіі на беларускай зямлі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Ордэнам Маці ўзнагароджаны шматдзетныя жанчыны Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей

**За нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў ордэнам Маці шматдзетных жанчын Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей. Адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 27 лістапада.**

Сярод удастоеных гэтай узнагароды — работніца сярэдняй школы № 2 г. Століна Таццяна Буян, прадавец магазіна Альшанскага філіяла Столінскага райспажыўсаюза Вольга Васюхневіч, аператар машыннага даення СВК «Наўгароды» Міёрскага раёна Ала Гаўрыльчык, індывідуальны прадпрымальнік з Гродна Таццяна Машніна, трэнер-выкладчык па настольным тэнісе Магілёўскай гарадской дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы № 1 Вольга Гур'ева.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ПАСТАНОВЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### Аб прызнанні паўнамоцтваў члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання Талкачова А.В.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Прызнаць паўнамоцтвы члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага скліканне Талкачова Анатоля Васільевіча, зарэгістраванага Цэнтральнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў як выбранага ад горада Мінска (пастанова Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ад 20 лістапада 2008 г. № 137 «Аб выніках паўторных выбараў і рэгістрацыі члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага скліканне»).

**Старшыня Савета Рэспублікі**
**Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**
**Б. БАТУРА**

*28 лістапада 2008 года, г. Мінск. № 27 — СР4/І*

### Аб абранні членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Талкачова А.В.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Абраць членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Талкачова Анатоля Васільевіча.

**Старшыня Савета Рэспублікі**
**Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**
**Б. БАТУРА**

*28 лістапада 2008 года, г. Мінск. № 28 — СР4/І*

## ЗАЯЎКІ НА ПЯТЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ТЭЛЕВІЗІЙНЫ КОНКУРС «ТЭЛЕВЯРШЫНЯ» БУДУЦЬ ПРЫМАЦЦА З 1 СНЕЖНЯ 2008 ГОДА

па 23 студзеня 2009 года. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла член аргкамітэта конкурсу, кансультант упраўлення электронных СМІ Міністэрства інфармацыі Беларусі Надзея Бельская. Конкурс праводзіцца па 20 намінацыях. Матэрыялы для ўдзелу ў Пятым Нацыянальным тэлевізійным конкурсе «Тэлевяршыня» неабходна накіроўваць на адрас Міністэрства інфармацыі Беларусі. Палажэнне аб конкурсе размешчана на сайце ведамства.

# У Беларусі занепакоеныя «мітуснёй» Расіі па пытанні развіцця Саюзнай дзяржавы

**Пасяджэнне Вышэйшага Дзяржсавета прэзідэнтаў Беларусі і Расіі ў Маскве, якое планавалася на 1 снежня, адкладзена з-за няўзгодненасці парадку дня саміта.**

Як паведаміла карэспандэнту агенцтва «Інтэрфакс-Захад» крыніца ў бліжэйшым акружэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, якая пажадала застацца неназванай, у Мінску «занепакоены «мітуснёй» расійскага боку па пытанні развіцця Саюзнай дзяржавы». «Беларусь заўсёды была і будзе гатовая ў любы час і ў любым фармаце — няхай гэта будзе сустрэча ў форме адзін на адзін або пасяджэнне Вышэйшага Дзяржсавета Саюза — абмяркоўваць любыя пытанні, звязаныя з саюзным будаўніцтвам», — падкрэсліла крыніца.

Суразмоўца агенцтва нагадаў, што 22 чэрвеня ў Брэсце і 25 кастрычніка ў Маскве паміж лідарамі дзвюх дзяржаў была «дасягнутая дакладная і канкрэтная дамоўленасць аб наданні новага імпульсу саюзнаму будаўніцтву, выходзячы з геапалітычных умоў, якія складваюцца». «Зыходзячы менавіта з гэтых дамоўленасцяў, беларускі бок прапанаваў таршыцца «рушыцца» парадак дня пасяджэння Вышэйшага Дзяржсавета праекты найважнейшых рашэнняў у палітычнай, эканамічнай і ваеннай сферах. Расійскі бок адмовіўся абмяркоўваць гэтыя пытанні на пасяджэнні Вышэйшага Дзяржсавета і прапанаваў разгледзець праекты дакументаў у закрытым фармаце.

Беларускі бок нагадзіўся і гатоў быў гэта зрабіць.

Аднак у апошні момант Крэмль адмовіўся ад раней дасягнутых дамоўленасцяў і даў згоду на правядзенне пасяджэння Вышэйшага Дзяржсавета выключна па «рушынным» парадку дня, які, да слова сказаць, не быў цалкам узгоднены», — адзначыў высокапастаўлены прадстаўнік Беларусі.

«Падобная «мітусня» проста незразумелая. Беларусь гатовая да сустрэч у любых фарматах. Але важна правядзенне гэтых сустрэч, уключаючы пасяджэнне Вышэйшага Дзяржсавета, не «для галачкі», не для ВДС як такога, а для рэальнага развіцця Саюза. Як вядома, прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін, патрэбна «субстантыўнае абмеркаванне пытанняў», — падкрэсліў суразмоўца агенцтва.

Прадстаўнік беларускага кіраўніцтва заявіў таксама аб гатоўнасці апублікаваць «усю папярэднюю сувязь, што не адбыўся, службовую перапіску паміж Мінскам і Масквой, з якой усё стане зразумелым», — падкрэсліў суразмоўца агенцтва.

Каментуючы тлумачэнні ананімнай крыніцы ў Крамлі, якія з'явіліся ў друку, аб прычынах пераносу сустрэчы прэзідэнтаў дзвюх краін, прадстаўнік Беларусі заявіў, што расцэньвае іх «як дэзынфармацыю».

# КАЛДАГАВОР ЯК СРОДАК АД... ЗВАЛЬНЕННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ХТО ПЕРШ-НАПЕРШ ВІНАВАТЫ?

*Работнік комплекснага прыёмнага пункта даў аднавяскоўцу «ў доўг» вянок. А неўзабаве праходзіць рэвізія, якая выяўляе недастачу ў 190 тысяч рублёў. Работніка звальняюць. І, да слова, ніякіх парушэнняў заканадаўства тут як быццам няма. Але ёсць адзін «пікантны» момант — пасля прыёму на работу з супрацоўнікам КПП не падпісалі дагавор аб матэрыяльнай адказнасці.*

— Калі такі дагавор падпісаны насамрэч не быў, то лічыць, што работнік нясе матэрыяльную адказнасць нельга, — зазначае Вадзім Браташ. — Нягледзячы на гэта, у выпадку здзяйснення работнікам, які непасрэдна абслугоўвае грашовыя і матэрыяльныя сродкі, вінаватых дзеянняў і ў тым ліку недастачы, падобны факт можа даць падставы да страты даверу з боку наймальніка і прывесці да звальнення. Разам з тым неабходна падкрэсліць: паводле артыкула 241 Працоўнага кодэкса, усе пытанні аб незаконнасці звальнення і аднаўлення на ранейшым месцы вырашаюцца толькі ў судзе. Плаціць пошліну тут зноў-такі не давядзецца. Аднак час на зварот у суд у дадзеным выпадку вельмі абмежаваны — усяго 1 месяц.

Гэтаксама ў суд неабходна звяртацца і ў выпадку, калі «забыліся» канчаткова разлічыцца пры звальненні. У такім разе работнік мае поўнае права патрабаваць свой сярэдні заробак за кожны дзень пратэрміноўкі. А калі разлік быў праведзены часткова, можна настойваць на спагнанні сярэдняга заробку прапарцыянальна нявыплачанай суме.

### ЕХАЦЬ ТРЭБА НЕ ЗАЎСЁДЫ

*Знайсці «лішняе» месца ў абсалютнай большасці рэгіёнаў складана. У той жа час у сталіцы колькасць вакансій перавышае колькасць беспрацоўных у некалькі разоў, а самі ўмовы ўладкавання ў найбуйнейшым горадзе краіны сталі больш ліберальнымі. Адсюль цалкам лагічнае пытанне: дзе можна даведацца, якія спецыялісты патрэбныя Мінску?*

Адразу можна сказаць, што шляхоў пошуку вакансій некалькі. Так, можна звярнуцца ў тэрытарыяльны аддзел па працаўладкаванні любога раёна сталіцы. Можна пацікавіцца свабоднымі месцамі ў аддзеле інфармацыйных тэхналогій Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама па вуліцы Пугачэўскай, 9. Але ці не самай зручнай для рэгіёнаў крыніцай застаецца інтэрнэт, у прыватнасці, электронны адрас minsk.gov.by/rabota.

### АДНАГО ЖАДАННЯ МАЛА

*Цікавы момант. Зусім хутка работніку споўніцца 59 гадоў. Ці можна тады скасаваць кантракт і выйсці на датэрміновую пенсію?*

— Выйсці на датэрміновую пенсію на год раней за агульны ўзрост можна выключна пры некалькіх умовах, — тлумачыць Вадзім Браташ. — Па-першае, чалавек павінен мець вялікі (як правіла, гаворка ідзе аб 33 гадах для жанчын і 38 гадах для мужчын) стаж. А, па-другое, чалавек павінен быць зарэгістраваны ў якасці беспрацоўнага. Прычым сёння права на датэрміновую пенсію з'яўляецца толькі тады, калі служба занятасці пацвердзіць — знайсці гэтаму беспрацоўнаму прымальнае месца ў рэгіёне нерэальна. Словам, стаць пенсіянерам да дасягнення агульнага ўзросту «па ўласным жаданні» немагчыма. А тым больш немагчыма грамадзяніну, які мае працоўны кантракт.

### БЕЗ АФАРМЛЕННЯ. АДНАК З ШАНЦАМІ

*Нарэшце, таксама «пенсійная праблема». Каб даглядаць старых бацькоў-інвалідаў І групы, жанчына кінула работу. Аднак сам догляд афіцыйна афармлены нідзе не быў. Ці могуць залічыць яго ў стаж?*

— Догляд інваліда І групы, незалежна ад ступені сваяцтва, можа быць залічаны ў стаж працаздольнаму чалавеку, які не працуе, не займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю, не атрымлівае пенсій і дапамог, пражывае ў адным населеным пункце з інвалідам і наведвае яго штодня, — адзначае начальнік аддзела пенсій і дапамог упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Іванаўскага райвыканкама Галіна Бяскроўная. — Прычым сам па сабе факт афіцыйнага афармлення тут не абавязковы — пацвердзіць догляд інваліда І групы для ўключэння гэтага часу ў стаж можна па паказаннях сведак.

**Сяргей ГРЫБ.**

*Мінск—Іванава.*

# ШТО НЕ ТАК, МАСКВА?

Погляд

**Апошнім часам з Масквы ў бок нашай краіны ідуць сігналы аб незадавальненні часткі расійскай палітычнай эліты паводзінамі Беларусі на міжнароднай арэне.**

Ужо не першы раз у штотыднёвай аналітычнай праграме «Постскриптум» маскоўскага тэлеканала ТВЦ гучыць ад імя Масквы крытыка Беларусі за яе быццам бы адыходжанне ад Расіі, намёкі на двайную гульню афіцыйнага Мінска, яго паступовую пераарыентацыю на Захад, лавіраванне паміж Масквой і Бруселем. Вось і ў мінулую суботу вядучы «Постскриптума» задаўся зусім не рытарычным пытаннем: «Ці не страчваем мы Беларусь?» Яго, аказваецца, моцна хвалюе тое, што ў нашай краіны з Еўрасаюзам паступова наладжваюцца адносіны ўжо, будзем спадзявацца, на якасна новым узроўні. Відаць, кагосьці ў Крамлі гэта вельмі насцярожвае. Напрыклад, у пералік сімптомаў страты Беларусі аднесена і тое, што пра А. Лукашэнку ў Еўрапейскім саюзе ўсё менш гавораць як пра «апошняга дыктатара Еўропы», што яму і шэрагу ключавых чыноўнікаў адменена забарона на ўезд у краіны Еўрасаюза, што ў Еўракамісіі абяцаюць крэдыты і развіваць супрацоўніцтва з Беларуссю. Чамусьці ў Маскве заклапочаныя і тым, што ў Бруселі не супраць падпісання з Беларуссю глабальнага гандлёвага пагаднення і згодныя нават даць «зялёнае святло» на яе ўступленне ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. І зусім не зразумела, прычым тут да праблем беларуска-расійскіх адносінаў Міжнародны валютны фонд, місія якога нядаўна правяла ў нас перамовы аб умовах прадстаўлення крэдыту на два мільярды долараў ЗША. Гэты яшчэ не выдзелены крэдыт у «Постскриптуме» таксама бачыцца як спроба каварнага Захаду адарваць Беларусь ад Расіі.

Чаму ЕС змяніў сваю тактыку ў дачыненні да Беларусі — вядучаму праграмы зразумела: Захад вельмі насцярожылі рашучыя дзеянні Расіі на Каўказе, а таму ў Бруселі імкнуцца спыніць геапалітычнае ўзмацненне Масквы, у тым ліку і спробамі аддаліць Беларусь ад Масквы. Яшчэ нядаўна там былі ўпэўненыя, што такое немагчыма. А цяпер у Крамлі не настолькі ўпэўненыя ў гэтым, з трывогай у голасе палохае аўдыторыю вядучы. Бо чаму Беларусь цягне з прызнаннем Паўднёвай Асеціі і Абхазіі?

У сваю чаргу хочацца спытаць: што вас так раздражняе, шаноўная Масква? Паляпшэнне адносінаў з Еўрасаюзам — гэта ў першую чаргу вынік плённай работы беларускай дыпламатыі на еўрапейскім накірунку і еўрапейскай дыпламатыі на беларускім накірунку. Павіншуйце нашых дыпламатаў, якія ўжо не першы год працуюць над пытаннямі часам моцна заблытанай і палітызаванай праблематыкі эканамічнага супрацоўніцтва з Еўрасаюзам. Бо палова нашага экспарту ідзе менавіта ў яго краіны. Значная частка атрыманай валюты потым ідзе за разлік за нятанныя расійскія нафту і газ.

І ўвогуле адкуль гэтыя не зусім зразумелыя хваляванні і сумненні наконт нашай вернасці як саюзніка? Здавалася, расійскіх партнёраў павінна было б узрадаваць тое, што мы ў пэўным сэнсе бяром прыклад з іх у імкненні актыўна супрацоўнічаць з Еўрасаюзам насуперак пярэчанням Польшчы і Літвы. Калі вы чулі з Мінску строгія рэкамендацыі, як Маскве праводзіць сваю знешнюю палітыку на Захадзе, ладзіць ці не сустрэчы ў Бруселі і Ніцы, супрацоўнічаць з НАТА, пракладваць у абыход Беларусі па дну Балтыйскага мора газаправод і г. д.

Хоць у Мінску, чаго хаваць, не ўсё падабаецца, што Расія робіць на міжнароднай арэне, як, у прыватнасці, будуе свае адносіны з краінамі СНД. Аднак мы разумеем і прымаем яе нацыянальныя інтарэсы. Няхай у Маскве таксама разумеюць, што і ў нас ёсць нацыянальныя інтарэсы, якія саюзнікам варта паважаць.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

## СНЕГ РАСТАЕ, ЗАТОЕ ГІРЛЯНДЫ ЗЗЯЮЦЬ

**Магілёўцы самі ствараюць святочны настрой. Гарадскія ўлады аб'явілі традыцыйны конкурс на лепшае навагоднее і каляднае афармленне.**

1 снежня ўсе арганізацыі абласнога цэнтра ўключаюцца ў барацьбу за прэміі гарвыканкама. Трэба па-святочнаму ўпрыгожыць фасады, рэкламныя шыльды, вокны і вітрыны будынкаў, а таксама ўваходы ў іх. Будуць улічвацца колькасць і якасць навагодніх упрыгажэнняў. Удзельнікі конкурсу таксама павінны паклапаціцца пра арганізацыю месцаў зімовага адпачынку на навакольнай тэрыторыі — з ёлкамі, ледовымі горкамі, культурна-гульнявымі праграмамі з удзелам Дзеда Мароза і Снягуркі. Вынікі конкурсу будуць падведзены ў першую дэкаду новага 2009 года. У розных намінацыях будуць вызначаны па тры пераможцы: яны атрымаюць прэміі ад 100 да 50 базавых велічынь. За актыўны ўдзел у навагоднім конкурсе прызначаць яшчэ і заахвочвальныя прэміі па 40 базавых велічынь.

**Ілона ІВАНОВА.**

## САСТАРЭЛЫ «ДЫВЕРСАНТ»

Ён залез на тэрыторыю дзіцячага аздараўленчага лагера «Церамок», які знаходзіцца ў в. Шчэбрын і адключыў трансфарматарную падстанцыю. У выніку шэсць вёсак Брэсцкага раёна засталіся без электрычнасці. Адключэнне зрабіў 68-гадовы жыхар в. Шчэрбін, ён у бальніцы з апёкамі ад электратоку.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## НА ПЕРАНОС РАБОЧЫХ ДЗЁН «АДРЭАГУЕ» І ТРАНСПАРТ

**Падчас калядных і навагодніх святаў графік працы сталічнага камунальнага пасажырскага транспарту будзе зменены.**

У прыватнасці, аўтобусы 25 і 28 снежня,1 і 4 студзеня будуць выходзіць на гарадскія маршруты па графіку нядзельных дзён, а 26 і 27 снежня, 2 і 3 студзеня будуць курсіраваць па раскладзе суботы.

Калі гаварыць адносна прыгарадных маршрутаў, дык 19, 20, 24 і 31 снежня аўтобусы будуць хадзіць па раскладзе пятніцы, 25 і 26 снежня, 1 і 2 студзеня — суботы, а 21, 27, 28 снежня і 3 і 4 студзеня — па графіку нядзелі. Тралейбусы і трамваі 25—27 снежня і 2—3 студзеня выйдуць на гарадскія маршруты па графіку суботы, а 28 снежня і 1, 4 студзеня — графіку нядзелі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## МУС Беларусі гатова да магчымага прытоку нелегальных мігрантаў у краіну

**Аб гэтым паведаміў журналістам міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў.**

Ён адзначыў, што ў сувязі са скарачэннем колькасці рабочых месцаў на тэрыторыі сумежных з Беларуссю дзяржаў некаторыя з працоўных мігрантаў, якія прыехалі ў гэтыя рэспублікі легальнымі, нелегальнымі шляхамі, паспрабуюць пранікнуць на тэрыторыю Беларусі. «Зразумела, яны не паедуць назад у свае рэспублікі, таму што там не было, а цяпер тым больш не будзе рабочых месцаў. Таму не выключана, што яны паспрабуюць пранікнуць на тэрыторыю Беларусі», — сказаў міністр. Уладзімір Навумаў падкрэсліў, што МУС прымае неабходныя меры, і яны адэкватныя існуючай сітуацыі.

**БЕЛТА.**

## Абзац

■ **З 1 снежня г.г. уводзяцца новыя правілы ўвозу на тэрыторыю Польшчы тытунёвых і алкагольных вырабаў. Грамадзяне, якія ўязджаюць у Польшчу з краін — не членаў Еўрасаюза, маюць права правезці за адзін раз 40 штук цыгарэт. Раней ліміт складаў 200 штук. Жыхары непамежнай зоны за адзін раз могуць увезці 1 л алкаголю мацункам больш за 22%, 2 л — мацункам менш за 22%, 4 л віна ці 16 л піва. Жыхары памежнай зоны маюць права правезці 0,5 л алкаголю мацункам больш за 22%, а таксама 0,5 л — мацункам менш за 22%.**

■ У Чэрыкаўскім раёне міліцыя затрымала двух мужчын, якія падазраюцца ў разбойным нападзе на таксіста. Каля 6 гадзін вечара ў машыну індывідуальнага прадпрымальніка, уладальніка таксі, селі двое мужчын, пад пагрозай нажа адабралі Br120 тысяч і зніклі. Пасля звароту пацярпелага ў міліцыю былі затрыманыя двое (35 і 20 гадоў), адзін з якіх раней прыцягваўся да суда. Вядзецца следства.

■ **У Брэсцкім дзяржаўным каледжы сувязі ўчора раніцай ліквідавана ўзгаранне. З будынка каледжа былі эвакуяваныя каля 500 чалавек. У выніку пажару пашкоджана мэбля і аддзелка аднаго з кабінетаў. Як мяркуецца, прычынай пажару стала кароткае замыканне ў адным з вучэбных трансфарматараў.**

■ Паездка ў гарадскім аўтобусе закончылася для гамяльчанкі пераломам рэбраў. Падчас тармажэння гарадскога аўтобуса № 12 пасажырка ўпала, у выніку чаго атрымала пералом рэбраў. Жанчына шпіталізаваная.

■ **Падчас сумеснага начнога рэйду Гродзенскай рыбінспекцыі і мясцовага пагранатрада на Аўгустоўскім канале быў затрыманы браканьер, у якога аказалася 12 кг рыбы. Двое яго саўдзельнікаў зніклі. Затрыманаму пагражае турэмнае зняволенне, так як у яго сетках выяўленая ў тым ліку і рыба сырць (рыбец), занесеная ў Чырвоную Кнігу Беларусі. Кошт адной такой асобіны — Br315 тыс.**

■ Позна ўвечары паблізу вёскі Барсукі ў Смалявіцкім раёне вадзіцель аўтамабіля «Фіят Дуката» не змог прадухіліць наезд на жанчыну, якая нечакана выйшла на дарогу перад блізкай машынай. А цёмнае адзенне і адсутнасць флікера не дазволілі вадзіцелю загадзя заўважыць пешахода. Ад атрыманых траўмаў жанчына загінула на месцы ДТЗ.

■ **Крызіс крызісам, а калядныя канікулы — згодна з раскладам. У адпаведнасці з гэтай высновай будуць святкаваць Новы год і Каляды некаторыя з нашых суседзяў. У Расіі, згодна з прынятымі рашэннямі, традыцыйныя Калядныя канікулы ў сувязі з крызісам адмяняцца не будуць. Яны, як і ў папярэднія гады, працягнуцца 10 дзён — з 1 па 10 студзеня ўключна. А Кабінет Міністраў Украіны рэкамендаваў кіраўнікам прадпрыемстваў, установаў і арганізацый з пяцідзённым працоўным тыднем зрабіць выхаднымі дні з 1 па 7 студзеня 2009 года. Такое распараджэнне Кабміна не датычыцца ўстаноў Пенсійнага фонду, «Укрпошты», дзяржаўнага казначэйства і банкаўскіх установаў.**

■ Трагічна пачаліся Калядныя распродажы ў ЗША: два чалавекі забітыя і адзін затаптаны. У першы ж дзень распродажаў пакупнікі аднаго з магазінаў нават не заўважылі супрацоўніка ўнівермага, што стаяў у дзвярах. Натоўп падчас адкрыцця дзвярэй проста знёс яго з ног. Мужчына, па якім літаральна прабегла 200 чалавек, апынуўся ў бальніцы, дзе памёр ад шматлікіх траўмаў. Яшчэ адзін выпадак здарыўся ў магазіне цацак. Двое мужчын (ці іх жонкі) не падзялілі цацку, пасля чаго прадстаўнікі моцнай паловы выхапілі пісталеты і смяротна паранілі адзін аднаго.

■ **На хімічным заводзе ў прамысловым комплексе горада Слау (35 км на захад ад Лондана) адбыўся моцны выбух і пажар. Відавочцы сцвярджаюць, што выбух быў чутны нават у суседнім Віндзары. Завод вырабляе паліграфічную прадукцыю і лакі для металаў і пластыку.**

## Поўны абзац

■ Органы сацыяльнай аховы горада Тарбей (Вялікабрытанія) выдаткавалі 30 тысяч фунтаў стэрлінгаў на... тапачкі для нецвярозых жанчын. Улады тлумачаць, што такім чынам хочуць зберагчы падгулялых дам, абутых у туфлі на абцасах, ад траўмаў у час Калядных святаў. Пачынаючы са снежня, тарбейскія паліцэйскія будуць насіць з сабой мяшкі з тапачкамі і ў выніку неабходнасці выдаваць іх жанчынам, якія будуць вяртацца з бараў і з карпаратыўных вечарынак.

■ **Вучань нямецкай школы, якога настаўнік выгнаў з урока за дрэнныя паводзіны, адпомсціў выкладчыку, разбіўшы яго асабісты аўтамабіль. Васьмігадовы хлопчык дачакаўся, калі закончыцца ўрок і настаўнік пакіне сваё працоўнае месца, украў ключ запальвання і сеў у аўтамабіль выкладчыка. Ён змог завесці транспартны сродак і, уключыўшы першую хуткасць, праехаў каля 25 метраў і ўрэзаўся ў прыпаркаваную Volvo. У паліцыі школьнік прызнаўся, што ён не хацеў разбіваць машыну, а толькі хацеў пабачыць сваю маці і паскардзіцца ёй на жорсткага настаўніка. Урон, нанесены юным вадзіцелем, ацэнены ў 8 тыс. еўра.**

■ У кіеўскім аэрапорце «Барыспаль» з кубка, заваяванага ўкраінскімі шахматыстамі на сусветнай шахматнай Алімпіядзе ў Германіі, знік брыльянт. Прайшоўшы мытныя працэдуры і атрымаўшы багаж, члены каманды выявілі, што сам кубак (сплаў срэбра і пазалоты) быў пашкоджаны, а ўкраплены каштоўны камень знік. Кіраўніцтва Федэрацыі шахмат Украіны падало адпаведную заяву ў міліцыю. У аэрапорце факт крадзяжу пацвердзілі, са шкадаваннем адзначыўшы, што ў апошні час звычка залазіць у рэчы пасажыраў стала вельмі распаўсюджанай у грузчыкаў тэрмінала. Заведзена крымінальная справа.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости»*

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

на право заключения договора аренды земельного участка общей площадью 10,0000 га сроком на 50 лет для строительства производственного объекта различного назначения, расположенного в районе д. Раков Воложинского района. Начальная цена предмета аукциона — 747 034 840 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.03.2008 г. Аукцион состоится **18.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **17.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015

# У СТАЛІЦЫ — НОВАЯ СХЕМА МАРШРУТАЎ ТРАНСПАРТУ

**У сувязі з будаўніцтвам участка першай лініі метрапалітэна ад станцыі «Інстытут культуры» да станцыі «Пятроўшчына» і закрыццём праспекта Дзяржынскага на ўчастку ад вуліцы Алібегава да праспекта Любімава з пачатку снежня ў схему маршрутаў сталічнага камунальнага пасажырскага транспарту ўносяцца змяненні.**

Паводле інфармацыі КУП «Мінсктранс», зачыняюцца тралейбусныя маршруты № 47 і № 63. Аўтобусныя маршруты №№ 28, 74, 84, 84Д і 90 будуць арганізаваны: з рухам з боку вуліцы Уманскай — па праспекце Дзяржынскага, вуліцы Алібегава, праспекце газеты «Звязда», вуліцы Голубева, праспектах газеты «Праўда» і Дзяржынскага; з боку вуліцы Касманаўтаў — па праспектах Дзяржынскага, Любімава, газеты «Праўда», вуліцы Алібегава, праспекце Дзяржынскага. Маршруты № 132 і № 542 будуць ісці па праспекце Дзяржынскага, вуліцы Алібегава, праспекце газеты «Звязда», вуліцы Голубева, праспектах газеты «Праўда», Любімава, Дзяржынскага ў абодвух накірунках.

№ 30 і № 30Д з рухам: у накірунку вуліцы Каржанеўскага — па вуліцы Алібегава, праспектах газеты «Праўда», Любімава, Дзяржынскага; у накірунку вуліцы Гарэцкага — па праспектах Дзяржынскага і Любімава, газеты «Праўда», вуліцы Голубева, праспекце газеты «Звязда», вуліцы Алібегава.

Маршруты №№ 32, 35, 41, 103, 117, 120 будуць ісці ў абодвух накірунках па праспекце Дзяржынскага, вуліцах Сямашкі і Чыгуначнай. № 81 — з рухам у абодвух накірунках па праспекце газеты «Звязда», вуліцы Голубева, праспекце газеты «Праўда», вуліцы Алібегава, праспектах Дзяржынскага, Жукава, вуліцы Чыгуначнай. Маршруты №№ 96, 96Д, 529 будуць пралягаць у абодвух напрамках па вуліцах Чыгуначнай, Сямашкі, праспектах Любімава, газеты «Праўда», вуліцы Голубева. № 104 — з рухам у абодвух напрамках па праспектах Любімава і Дзяржынскага.


Фота БЕЛТА.

Маршрут № 81Ш будзе ісці: з боку ДС «Сямашка» — па вуліцы Сямашкі, праспекце Любімава, вуліцах Рафіева, Голубева і далей па маршруце; з боку ДС «Малінаўка-4» — па вуліцы Голубева, праспектах газеты «Звязда» і Любімава, вуліцы Сямашкі. № 156 — са следаваннем: з боку ДС «Дружная» — па праспекце Дзяржынскага, вуліцы Алібегава, праспекце газеты «Звязда», вуліцы Голубева, праспектах газеты «Праўда» і Любімава; з боку МКАД — па праспектах газеты «Звязда», Любімава, газеты «Праўда», вуліцы Алібегава, праспекце Дзяржынскага.

Схема тралейбусных маршрутаў запланавана наступнай. № 18 будзе ісці ў абодвух напрамках па вуліцы Ясеніна, праспекце Дзяржынскага, вуліцах Сямашкі, Чыгуначнай, Уманскай, Гурскага, Панамарэнкі, праспекце Пушкіна. № 25 і № 65 — з рухам у абодвух напрамках па праспекце Дзяржынскага, вуліцах Сямашкі і Чыгуначнай. Маршруты №№ 31, 36 і 40 арганізаваны ў абодвух накірунках па вуліцы Голубева, праспекце газеты «Звязда», вуліцы Алібегава, праспекце Дзяржынскага. № 45 — з рухам у абодвух накірунках па вуліцы Рафіева, праспекце Любімава, вуліцах Сямашкі і Чыгуначнай. № 36Д і № 53 — з рухам: з боку ДС «Малінаўка-4» — па вуліцах Рафіева, Алібегава, праспекце Дзяржынскага і далей па маршруце; з боку ДС «Зялёны Луг — 7» — па праспекце Дзяржынскага, вуліцы Алібегава, праспектах газеты «Звязда» і Любімава. № 64 — з рухам у абодвух накірунках па праспекце Любімава, вуліцах Сямашкі і Чыгуначнай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

| Наименование объекта | Изолированное помещение (аптечный пункт первой категории) | Изолированное помещение (аптека № 131) |
|---|---|---|
| Местонахождение объекта | Брестская обл., Каменецкий р-н, д. Ратайчицы, ул. С.Вирко, 84 | Брестская обл., Ганцевичский р-н, д. Денисковичи, ул. Мира, 1 |
| Продавец объекта | Брестское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация» | |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество» | |
| Начальная цена продажи, руб. | 26 682 494 | 57 485 622 |
| Сумма задатка, руб. | 2 668 000 | 5 748 000 |
| Характеристика объекта/площадь земельного участка, га, реш. об отводе зем. участка | Здание 1958 г.п., стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная, забор дощатый, площадь здания – 56,3 кв.м/ 0,0337 га, реш. Каменецкого районного Совета депутатов от 30.12.1993г. | Здание 1976 г.п.. фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша рулонная, совмещенная, площадь – 168,1 кв.м/0,030 га в общем долевом пользовании, реш. Ганцевичского РИК от 03.10.2006 № 718 |

Аукцион состоится **22 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Порядок оформления участия в аукционе и проведения аукционных торгов определяются Положением о проведении аукционов по продаже объектов республиканской собственности и права на заключение договора аренды нежилого помещения, утвержденным постановлением Министерства по управлению государственным имуществом и приватизации Республики Беларусь от 27.10.2000 № 19.

Более подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 10.10.2008 № 192.

*Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по* ***21 декабря 2008 года*** *включительно.*

**Контактные телефоны: 8(0162) 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63, www. brest–region.by**

# Мікалай II прыносіць грошы ў магілёўскі бюджэт



Рэстаўрацыя званіцы ў Пустынскім манастыры.

**Морачка! От было б на Беларусі мора, то Міністэрства спорту і турызму было б самым багатым, нават багацейшым за нафтавікоў і салігорскіх шахцёраў. А што — паставіў касіраў на ўваходах на пляжы — і грабі грошы рыдлёўкай. Плюс гатэлі, кавярні, фота з малпачкай і гэтак далей. Але няма ў нас ні мора, ні малпаў, а касіраў у голым полі ставіць сэнсу няма. Таму ў нашых турыстычных фірмаў і арганізацый працы хапае: каб турыст пакінуў тут свае грошы, трэба распрацаваць маршрут, знайсці якую-небудзь разыначку, каб турыст не толькі паехаў па Беларусі, але і застаўся задаволены, і знаёмым сваім расказаў пра цудоўныя нашыя мясціны...**

## На ўсход ад Мсціслава

Сёння мы пагаворым пра турыстычны патэнцыял Магілёўшчыны, праўда, не ўсёй, а толькі Мсціслава і ўласна Магілёва. Менавіта ў гэтыя дзве кропкі Міністэрства спорту і турызму арганізавала прэс-тур з мэтамі паказаць нам, журналістам, турыстычны патэнцыял гэтага рэгіёна.

На жаль, па Мсціславу мы праехалі «галопам»: толькі паспявалі круціць галавой то налева, то направа, спрабуючы паспець за ўказаннямі экскурсавода разгледзець то царкву, то касцёл, то Замкавую гару, то пажарную вежу... Але нас супакоілі — маўляў, прыязджайце ў Мсціслаў пазней, у годзе недзе ў 2016, і мы вам пакажам турыстычную зону проста экстра-класа.

А павезлі нас далей на ўсход — у Пустынскі Свята-Успенскі манастыр, які размясціўся амаль ля самай мяжы з Расіяй, за дзясятак з хвосцікам кіламетраў ад Мсціслава. Згодна з легендай, гэты манастыр быў заснаваны яшчэ у 1380 годзе. Калісьці ў тыя далёкія-далёкія часы мсціслаўскі князь Лунгвен сур'ёзна захварэў і амаль аслеп. Але неўзабаве ён прысніў старца, які яму параіў: «Калі хочаш пачаць бачыць, ідзі ў пустынь, адшукай там крыніцу і абмый вочы». Князь так і зрабіў і (о, цуд!) да яго вярнуўся зрок. І першае, што ўбачыў спадар Лунгвен, гэта быў абраз Багародзіцы, які з'явіўся сярод галін дрэва над крыніцай. І князь загадаў заснаваць тут манастыр, а над крыніцай пабудаваць капліцу. Канчаткова ж архітэктурны ансамбль Пустынскага манастыра склаўся ў XIX стагоддзі.

У савецкія часы манастыр спыніў сваё існаванне, а ў будынках, якія вызваліліся, размясціліся інтэрнат і школа. Для дзяцей пераабсталявалі памяшканні Успенскага сабора, Пакроўскай царквы і кялейнага корпуса ў спальні і класы. У Вялікую Айчынную вайну дзіцячы дом таксама працаваў, будынкі манастыра нават не былі пашкоджаныя. Але недзе ў 1960 годзе зачынілі дзіцячы дом, у 1970-м — школу, і былы манастырскі двор апусцеў. Будынкі сталі разбірацца па цаглінках і да XXI стагоддзя яны дайшлі ў вельмі непрывабным стане.

У 2003 годзе ў Пустынкі вярнуліся манахі з намерам адрадзіць манастыр. Пахадзілі, паглядзелі на голыя сцены і, як расказвае іерадыякан Цярэнцій, нават засумняваліся, ці ўдасца ажывіць старыя сцены. Але здарыўся цуд — на сцяне невялічкага будынка на тэрыторыі манастыра з'явіўся абраз з абліччам Хрыста. Гэты знак манахі ўспрынялі як доказ таму, што Пустынскаму манастыру абавязкова трэба адрадзіцца. І манастыр сапраўды пакрысе адраджаецца: сёння тут жывуць 4 манахі, 4 паслушнікі і некалькі труднікаў, часткова адрэстаўраваная званіца, у планах — рэстаўрацыя Пакроўскай царквы з кялейным корпусам.

А аблічча Хрыста цяпер стала аб'ектам паломніцтва нароўні з крыніцай, што дапамагла калісьці князю Лунгвіну. Верыць у нерукатворнасць гэтага абраза ці не — кожны вырашае сам. Але ніякіх навуковых экспертызаў, каб пацвердзіць ці абвергнуць цуд, не праводзілася.

Калі так падсумаваць убачанае і пачутае, то манастыр у Пустынках можа стаць даволі цікавай кропкай на карце Беларусі — як у духоўным плане, так і ў турыстычным. Давайце лічыць і загінаць пальцы. 1. Лячэбная крыніца, да якой і сёння едуць сотні ахвотнікаў акунуцца ў купель і папіць святой вадзіцы. 2. Выява з абліччам Хрыста, што з'явілася цудоўным чынам. 3. Будынкі манастыра (пасля рэстаўрацыі). 4. Сутарэнні і падземныя хады. Яны там дакладна ёсць, але існуюць меркаванні, што падземныя хады ідуць у трох напрамках — адзін у бок Расіі, а два іншых — у бок Мсціслава, да двух храмаў. Калі будзе праходзіць рэстаўрацыя будынкаў, хады паспрабуюць аднавіць і адкрыць для наведвальнікаў. 5. Ну і плюс прыгожыя мясціны, мяжа з Расіяй, байкі з гісторыі манастыра і гэтак далей.

## Магілёў заалагічны

Наступная кропка нашага падарожжа — Магілёў. Калі пачынаць пісаць пра гэты горад, то можна спісаць два вазы і цэбар паперы, а ўсяго і не напішаш. Але самым новым, самым цікавым і самым эксклюзіўным мы нашых чытачоў пачастуем.

Напэўна, усе ўжо ведаюць пра магілёўскі заасад, што знаходзіцца цераз дарогу ад Буйніцкага поля. Пакуль гэта аб'ект досыць звычайны для свайго тыпу: як і ў любым заапарку свету, трэба заплаціць грошы і хадзіць любавацца дзікімі звярамі. Адзінае, што звяры тут у большасці не экзатычныя, а нашы, беларускія — ласі, рысі, дзікі, зубры, алені, ваўкі і гэтак далей. Ну гэта і зразумела, бо заасад знаходзіцца ў структуры Магілёўскага аграпесатэхнічнага каледжа імя К.П. Арлоўскага, дзе рыхтуюць леснікоў і егераў. Але хутка магілёўскі заасад можа стаць проста ўнікальным аб'ектам, калі планы, пра якія расказаў дырэктар каледжа Георгій Маліноўскі, ажыццявяцца:

— Мы ўжо практычна пабудавалі міні-чыгунку, — расказвае Георгій Мікалаевіч і вядзе нас да новай чыгункі, непадалёк ад якой разлягліся ў чыстым полі зубры. — Два кіламетры чыгуначнага палатна праз каньён і праз адзін мост, вышыня якога роўная шасціпавярховаму дому. Пабудавалі перон і дэпо для лакаматыва з вагонамі. На ўсё гэта нам было выдзелена 11 млрд рублёў, з якіх 6,3 — прэзідэнцкіх. Цягнік мае два вагоны на 48 чалавек і дызельны рухавік на 75 конскіх сілаў, зроблены пад даўніну. Ён паступіць у другой палове снежня з Італіі. Грошы пералічаны. Квіток на цягнік будзе каштаваць каля 4 тысяч, запланаваны час падарожжа па заасадзе — 45 хвілін. Гэта будзе наш варыянт сафары, але з міні-цягнікам. У Еўропе такога няма. Ёсць яшчэ адзін праект, ідэя якога вырасла з ідэі музея для рыбаў — мы хочам пабудаваць акіянарыум! Праект практычна закончаны — яго распрацоўкай займаецца піцерскае ЦКБ «Рубін», а акадэмік Ігар Спаскі ўзяўся асабіста курыраваць праект. Гэта будзе вялізная ракавінка на тры паверхі з некалькімі акварыумамі: у адным, на 800 тон вады, будуць плаваць акулы — 20—25 галоў, у другім, на 600 тон, — цюлені, у трэцім, з 35-метровым калідорам пад вадой, — розныя віды рыбаў, ну і будуць яшчэ каля 30 меншых акварыумаў з беларускімі і экзатычнымі рыбамі. Ну і нарэшце, трэці праект, — працягвае расказваць Георгій Мікалаевіч, — звязаны з Панскім возерам, якое тут непадалёк. Мы пракапаем туды канал метраў 200 з Дняпра, каб у гэтае возера маглі заплываць катэры. Далей — фунікулер наверх. А там раней было лецішча Піпенберга, падмурак якога захаваўся. Мы хочам гэты будынак аднавіць і зрабіць там гатэль з рэстарацыяй, а побач — турыстычны пасёлак з 20—35 хатак. Адтуль да цэнтральнага ўвахода будзе дарожка з пліткі, асфальтавая дарога для веласіпедаў і са спецыяльным пакрыццём для коней...

Слухаеш дырэктара каледжа і пакрысе прыходзіш у захапленне ад такіх напалеонаўскіх планаў. А ці збудуцца яны? Асабіста я даю веры Георгію Мікалаевічу на 100 працэнтаў — калісьці тут былі палі ды ўзгоркі, а цяпер — заасад, калісьці чыгунка была толькі на стэндзе, а цяпер — яе можна памацаць... Амаль дабудаваны вальер для страусаў, прызначана месца для летняй сцэны... То чаму б і астатнім планам не спраўдзіцца?.. Дарэчы, па словах намесніка старшыні Магілёўскага гарвыканкама Фёдар Міхеенкі, хутка плануецца працягнуць маршруты тралейбусаў якраз да заасаду і да Буйніцкага поля, а то дабірацца да іх зараз трохі няздручна.



Партрэт-абраз Мікалая II, знойдзены ў тайніку.

## Мікалай II і Магілёў

Сёння па Магілёве распрацавана 16 турыстычных маршрутаў: «Храмы Магілёву», «Вайна 1812», «Сіманаў у Магілёва», «Абарона Магілёва ў гады Вялікай Айчыннай вайны» і іншыя. Але я вам раскажу толькі пра самы новы маршрут, які цяпер актыўна раскручваецца — «Магілёў — апошняя рэзідэнцыя апошняга рускага імператара Мікалая II».

Мікалай II пражыў у Магілёве са жніўня 1915 года, калі сюды была перанесена Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага, і да арышту ў сакавіку 1917 года. І цяпер турыстам спрабуюць паказваць тыя месцы, дзе бываў рускі імператар — Палыкавіцкую крыніцу, Свята-Нікольскі манастар, чыгуначны вакзал, будынак былой крамы Берштэйна, тэатр і іншыя. Цікава, што гэты малады маршрут паспеў абрасці легендамі, якія турысты слухаюць з адкрытым ротам. Напрыклад, легенда-быль пра партрэт-абраз Мікалая II. Наколькі яна праўдзівая, сказаць сёння ўжо цяжка, бо ад розных людзей я чуў розныя падрабязнасці. Дык вось, 14 жніўня 2000 года Мікалай II быў кананізаваны Рускай праваслаўнай царквой. І нібыта перад гэтым у Магілёве ў доме нумар 48 па вуліцы Піянерскай адзін чалавек скончыў жыццё самагубствам. Туды прыйшлі будаўнікі рабіць рамонт і за адной сцяной (ці то ў пакоі, ці то ў сутарэннях) знайшлі тайнік, дзе захоўваўся партрэт Мікалая II у поўны рост. Аўтарства, час напісання і гісторыя яго невядомыя. Але гэта не ўсё. Трохі пазней у гэты ж дом завітаў святар, які павінен быў асвяціць адрамантаванае памяшканне (самагубства ж усё-ткі). І ён забыўся ўзяць з сабой абраз. Што рабіць? Вяртацца ў царкву па абраз? А от і не — святар заўважыў партрэт Мікалая II і, паколькі апошні імператар Расійскай дзяржавы ўжо быў кананізаваны і з'яўляецца святым, асвяціў з дапамогай яго памяшканне. Пасля партрэт забралі ў Свята-Нікольскі манастыр, дамалявалі німб і павесілі ў царкве. Але і гэта яшчэ не ўсё! Да партрэта-абраза зараз яшчэ прымацавана залатая пяцірублёвая манета, якая мае таксама сваю гісторыю. Яе ў 1916 годзе, па легендзе, атрымаў у царкве ад самога Мікалая II маленькі хлопчык Сямён Халімаў, які захоўваў яго ўсё жыццё і завяшчаў Свята-Нікольскаму манастыру. А тут якраз да месца і партрэт знайшоўся...

Па словах экскурсаводаў, тэма сям'і Раманавых вельмі запатрабаваная як сярод рускіх, так і сярод іншаземцаў. Некаторыя асабліва ўражлівыя нават у канцы экскурсіі плачуць перад партрэтам-абразом у Свята-Нікольскім манастыры.

— Што датычыцца маршруту «Магілёў — апошняя рэзідэнцыя Мікалая II», то гэта была мая асабістая ідэя, — кажа Алена Карпенка, дырэктар ДКУП «Магілёўаблтурыст». — З самага першага дня я вельмі доўга спрабавала пераканаць улады нашага горада і ўсіх астатніх у неабходнасці гэтага маршруту. Я лічу, што менавіта дзякуючы гэтаму маршруту ў горад пачалі ездзіць людзі. Летась было каля 400 чалавек, сёлета — ад 2 да 2,5 тысячы. Мы супрацоўнічаем з піцерскай фірмай, якая прымае турыстаў з Еўропы, Аўстраліі і Амерыкі і прапануе ім завітаць і ў Магілёў.

...Нялёгкі хлеб у нашых турыстычных прадпрыемстваў. Трэба нешта прыдумваць, вышукваць «разынкі» і адначасова даганяць еўрапейскі ўзровень сэрвісу. Хто ведае, мо калі і без мора мы на турызме шмат грошай у бюджэт зарабляць будзем. Вось як, напрыклад — Магілёўшчына:

— Мы стварылі ў аддзеле спорту і турызму спецыяльны сектар, паколькі такімі пытаннямі ніхто і ніколі не займаўся, — кажа намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Фёдар Міхеенка. — Мы добра ведаем, што ёсць краіны, дзе працэнтаў 30 у бюджэце займаюць турыстычныя паслугі. Мы пачалі цалкам з мізэру. Калі першы раз падводзілі вынікі, то сказалі губернатару, што выканалі заданне на мільярд рублёў. На гэта ён адказаў, што калі б вы да 10 мільярдаў яго давалі, былі б малайцы... Ну а сёння за 9 месяцаў 2008 года турыстычнымі арганізацыямі горада зроблена паслуг на агульную суму 8,369 млрд рублёў, што складае 104 працэнты планавага задання, тэмпы росту ў супастаўных цэнах — 154,5 працэнта, а экспарт турыстычных паслуг — 993,9 тысячы долараў ЗША.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

---

Рэзананс

# А помніка і не будзе?

## альбо Дазвольце быць суб'ектыўным

На жаль, праблемы, аб якіх гавораць нашы чытачы на старонках газеты, чамусьці часта ўспрымаюцца мясцовымі ўладамі як крытыка ў іх адрас. А журналістаў абвінавачваюць у суб'ектывізме. А як наогул быць не суб'ектыўным, не мець права на ўласныя думкі? Проста складаецца ўражанне — праблемы і ініцыятывы радавых суграмадзян проста часта «незразумелыя» для асобных чыноўнікаў на месцах? Артыкул «А помніка ўсё няма!» быў надрукаваны 30 кастрычніка ў «Звяздзе» пад рубрыкай «Чытачы ўзнімаюць праблему». Нагадаю: у віцебскі карпункт «Звязды» звярнуліся актывісты ваенна-патрыятычнага клуба «Пошук», якому споўнілася 25 гадоў. Клуб аб'ядноўвае дзясяткі людзей розных узростаў, неабыякавых да гісторыі. Актывісты клуба і старшыня Анатоль Бурдо расказалі пра тое, што неаднаразова прапаноўвалі гарадскім уладам паставіць помнік ахвярам выпрабаванняў атамнай зброі і аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Аналагічныя помнікі, адзначылі актывісты, ёсць у Гомелі і Брэсце. Каб з'явіўся ён у Віцебску, нават дэпутата парламента прасілі дапамагчы. Дарэчы, браліся энтузіясты самастойна сабраць грошы на ўстаноўку. Тым больш і раней так было ў практыцы клуба. Але далей абяцанняў падтрымкі справа не пайшла.

Рэдакцыя пасля публікацыі атрымала афіцыйны адказ з Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта. У ліку іншага ў гэтым дакуменце гаворыцца, што ўстаноўка такога помніка ў горадзе Віцебску не прадугледжана, бо няма адпаведнага «радка» ў так званым «плане па манументальна-мастацкім афармленні Віцебска, зацверджаным рашэннем Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 11.06.1998 № 467».

Затое ў лісце адзначана, што цяпер вядуцца работы па завяршэнні мемарыяльнай дошкі Герою Сацыялістычнай Працы, ганароваму грамадзяніну г. Віцебска Авечкіну А.П. Ён доўгі час быў кіраўніком знакамітага віцебскага прадпрыемства «Маналіт». Пра спробу зрабіць і павесіць такую дошку на фасадзе дома, дзе жыў гэты кіраўнік, расказвалі ў публікацыі ў «Звяздзе» актывісты клуба «Пошук». Значыць, не заўсёды «крытыка» дарэмная?

І добра таксама, што як адзначана ў лісце з гарвыканкама, да 65-годдзя Перамогі распрацоўваецца цэлы комплекс мерапрыемстваў. Цытата: «Сярод іх — рэканструкцыя плошчы Перамогі, працяг работ па стварэнні мемарыяла на тэрыторыі былога канцлагера». У лісце таксама адзначана, што за перыяд 2005—2007 гадоў у Віцебску адкрыты 11 манументальных і манументальна-скульптурных твораў.

Ліст з гарвыканкама завяршаецца так (у перакладзе з рускай мовы): «У 2008 годзе А. Пукшанскі ўказвае на ўстаноўку скульптурнай формы «Вулічны клоўн», які стаў любімым мясцовымі жыхарамі і турыстамі. Але чамусьці аўтар артыкула не гаворыць аб адкрыцці мемарыяльнай дошкі народнаму пісьменніку Беларусі, Герою Сацыялістычнай Працы, лаўрэату Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР, Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа і літаратурнай прэміі імя Я. Коласа Васілю Быкаву, якое адбылося 25 верасня 2008 года ў рамках акцыі «Мы — беларусы». Аўтарам артыкула А. Пукшанскім выказваецца суб'ектыўная думка, не ўлічваючы праведзенай работы ў горадзе ў частцы, што датычыцца манументальных і манументальна-скульптурных твораў».

Што тут скажаш? На жаль, так і не зразумела чаму ўсё-такі нельга, хай і ў будучым, але паставіць «чарнобыльскі помнік»? Проста яшчэ раз пастарацца зразумець энтузіястаў, уважліва абмеркаваць іх прапанову? Унесці адпаведную карэкціроўку ў той самы план? Ніяк? Пра ўсе «кругі», якія абышлі ў свой час энтузіясты-пошукаўцы, расказвалася ў першым артыкуле. Дарэчы, незадоўга да таго, як пісаў гэты, зноў патэлефанавалі з «Пошуку» і паднялі праблему стварэння мемарыяльнага музея ў Полацкім раёне. Маўляў, і экспанаты перададзены і інш., а экспазіцыі ўсё няма. Напішаш пра гэта, атрымаеш адказ ад чыноўнікаў пра тое, што зроблена ў раёне і з абвінавачваннямі ў суб'ектывізме?

Дарэчы, пра апошняе. СМІ і інфармацыйныя агенцтвы літаральна «хорам» выдалі інфармацыю пра «Вулічнага клоўна», у якой падкрэслівалася, што гэта — першая ў Віцебску «манументальная дэкаратыўная скульптура. Такіх «неафіцыйных» у краіне ўсё больш. І гэта добра: такія «фішкі» вельмі падабаюцца турыстам, ды і самім жыхарам. Далёка для параўнання ехаць не трэба — у Полацку паставілі помнік купцу, у Мінску ўжо даўно ёсць і дама з парасонам і шмат яшчэ чаго цікавага. Менавіта пра неабходнасць упрыгожваць вуліцы і скверы такімі неафіцыйнымі манументальнымі скульптурнымі творамі і хацелася давесці да ўвагі ўладаў. Нагадаю, помнік «клоўну» з'явіўся дзякуючы прапанове заслужанага артыста — маскоўскага цыркача Мікалая Чалнакова.

А чаму б не паставіць у Віцебску помнік «Старому Хатабычу» (аўтар аповесці-казкі Лазар Лагін жыў нейкі час у горадзе над Дзвіной). А вуліца Шагала дзе ў Віцебску — ведаеце? Аказваецца, не без цяжкасцяў можна адшукаць такую на карце — на ўскраіне горада. І, памятаю, энтузіясты прапаноўвалі зусім іншы варыянт — у цэнтры. А дзе ж яшчэ — дзякуючы Шагалу Віцебск ведаюць ва ўсім свеце! А той жа Малевіч, які працаваў у горадзе? Няўжо нельга неяк «абыграць» гэты факт, каб нешта авангарднае, як гаворыцца, «па тэме» з'явілася ў Віцебску? Помнік заснавальніцы горада — княжне Вользе толькі запланавана паставіць...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

---

Кватэрнае пытанне

# Любы крэдыт... Любога банка

**Для набыцця дома мы ўзялі ў банку крэдыт на агульных умовах, г.зн. не льготны. Ці можна для яго пагашэння выкарыстоўваць чэкі «Жыллё» (нашы ўласныя і падораныя сваякамі)? Якія патрэбны для гэтага дакументы і куды звяртацца?**

**З. Яўсееў,** *Брэсцкая вобласць.*

Перш за ўсё неабходна звярнуць увагу на тое, што ў адпаведнасці з Дэкрэтам кіраўніка дзяржавы ад 7 чэрвеня 2005 г. № 6 індэксацыі для выкарыстання ў адпаведнасці з заканадаўствам падлягаюць перарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку чэкі «Жыллё».

Парадак індэксацыі чэкаў «Жыллё», у тым ліку і пры іх выкарыстанні грамадзянамі і членамі іх сем'яў для пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў (уключаючы выплату працэнтаў за карыстанне імі), узятых і выкарыстаных на куплю дома вызначаны Палажэннем аб парадку індэксацыі імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 лістапада 2006 г. № 1529).

Палажэнне не змяшчае спецыяльнага ўказання на тое, што за кошт праіндэксаваных чэкаў «Жыллё» можа пагашацца запазычанасць толькі па льготных крэдытах, якія прадастаўляюцца ААБ «Беларусбанк». Значыць, індэксацыя чэкаў «Жыллё» можа ажыццяўляцца ва ўстаноўленым парадку і для пагашэння запазычанасці па любых банкаўскіх крэдытах (у тым ліку не льготных, якія атрыманы не толькі ў ААБ «Беларусбанк», але і ў іншых банках).

Разам з тым неабходна звярнуць увагу на тое, што праіндэксаваныя могуць быць чэкі «Жыллё» толькі грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (у дачыненні да гэтага выпадку сям'я на момант набыцця дома павінна была знаходзіцца на законных падставах на кватэрным уліку).

Грамадзяне маюць права на індэксацыю чэкаў «Жыллё», налічаных ім ва ўстаноўленым парадку (уключаючы жыллёвыя квоты мужа (жонкі), бацькоў, дзяцей, усынавіцеляў, усыноўленых, родных братоў і сясцёр, дзеда, бабкі, унукаў, аб'яднаныя на імя гэтых грамадзян) і (або) атрыманых у выніку дарэння ад гэтых блізкіх сваякоў, налічаных дарыльшчыку ва ўстаноўленым парадку (уключаючы жыллёвыя квоты гэтых асобаў, аб'яднаныя на імя дарыльшчыка) альбо атрыманых дарыльшчыкам па дамовах дарэння, у спадчыну або ў адпаведнасці з рашэннем суда пры ўмове, што грамадзяне, якім гэтыя чэкі першапачаткова былі налічаны ва ўстаноўленым парадку (уключаючы жыллёвыя квоты, аб'яднаныя на імя гэтых грамадзян), у дачыненні да таго, хто адорваецца, уваходзяць у лік блізкіх сваякоў, а таксама атрыманых у спадчыну або ў адпаведнасці з рашэннем суда.

Для індэксацыі чэкаў грамадзяне, поўнагадовыя члены іх сем'яў, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, сумесна ажыццяўляюць набыццё жылых памяшканняў і выказалі жаданне выкарыстаць належныя ім чэкі на пагашэнне крэдыту, падаюць адпаведную заяву ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, у якім яны знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (знаходзіліся на ўліку на момант прадастаўлення крэдыту). Пры набыцці жылых памяшканняў шляхам куплі да заявы дадаецца копія дамовы куплі-продажу.

Даведка аб налічанай жыллёвай квоце, даведка аб знаходжанні на кватэрным уліку, даведка аб запазычанасці па вяртанні крэдыту на момант звароту грамадзяніна і іншыя дакументы, неабходныя для прыняцця рашэння па заяве аб індэксацыі чэкаў «Жыллё», запытваюцца і атрымліваюцца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

**Віктар САВІЦКІ.**

---

Памяць

# АДЗІН З ТРОХ ТЫСЯЧ

Днямі ва ўрочышчы Смалярка адкрылі помнік ахвярам фашызму. Яшчэ адзін у Бярозаўскім раёне. Недалёка ад гэтай мясціны стаіць абеліск, які ўвекавечыў памяць 55 тысяч чалавек, вязняў гета з Брэста і іншых гарадоў. Іх забілі пад Бярозай Картузскай. Цяпер гэта назва вядомая ў многіх краінах свету. Але амаль ніхто не ведаў, што побач знаходзіцца лапік зямлі, паліты крывёю яшчэ трох тысяч чалавек.

Упершыню расказала грамадскасці аб месцы трагедыі настаўніца роднай мовы і літаратуры мясцовай школы Лізавета Барысаўна Мшар. Разам з вучнямі з краязнаўчага гуртка «Пошук» яны запісалі сведчанні старажылаў, якія памяталі пра тыя



страшныя дні лістапада 1942 года. У лес каля вёскі Смалярка сагналі тры тысячы яўрэяў, вязняў Бярозаўскага гета. Відавочцы сцвярджалі, што разам былі жанчыны і дзеці іншых нацыянальнасцяў — членаў сем'яў камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі. Іх партыямі тут расстрэльвалі. Потым целы спальвалі, усё старанна маскіравалі і садзілі зверху дрэвы. У гэтых маляўнічых мясцінах людзі адпачывалі, збіралі грыбы, ягады, не падазраючы, што ходзяць па трох аграмадных брацкіх магілах.

Праз 66 гадоў ля Смаляркі ўстанавілі помнік. Спонсарамі высакароднай справы сталі грамадзяне Вялікабрытаніі Майкл і Дыяна Лазарусы, а таксама прадпрымальнік з Бярозы Галіна Арсланава. На ўрачыстае адкрыццё сабраліся прадстаўнікі дыпламатычных місій і грамадскасці многіх краін свету. Шкада, што да гэтага дня не дажыў Сямён Бакштэйн — адзіны, каму ўдалося ўцячы з месца расстрэлу. Пяцігадовае дзіця ўратаваў лес. Пра незвычайны лёс Сімы расказала Наталля Кавалевіч, вядучы метадыст Бярозаўскага аддзела культуры. Бацькі Наталлі Іванаўны добра ведалі Сямёна Бакштэйна і гісторыю яго збаўлення. Маці Сімы па дарозе да ямы літаральна адкінула яго ў лес, перад тым угаварыла яго бегчы далей. Хлопчыка ўсё ж заўважылі, стралялі ўслед, потым выпусцілі сабак. Але маленькае, хударлявае нават на свой узрост дзіця нейкім чынам забілася ў лісіную нару, і сабакі згубілі след.

Колькі хлопчык там сядзеў, ён, вядома, не памятаў, яму здавалася, што прайшлі гады. Потым голад выгнаў Сіму з хованкі. І ўсё роўна малое дзіця амаль у зімовым лесе было асуджана на пагібель, ды зноў адбыўся цуд — яго заўважылі партызаны і забралі ў атрад. Камандзір атрада Пётр Лебедзеў фактычна выгадаваў Сямёна. Пасля школы гэты сціплы, сарамяжлівы, невялічкага росту чалавек шмат гадоў працаваў падвозчыкам у сістэме спажыўсаюза: падвозіў на коніку тавары ў гандлёвыя пункты. Пажылыя жыхары Бярозы ўспаміналі і такі факт, які ў многіх выклікаў здзіўленне. Падчас святкавання Дня Перамогі ці Кастрычніцкіх святаў у 50—60-х гадах Сямён заўсёды быў на трыбуне ў шэрагу кіраўнікоў раёна. А справа ў тым, што былы камандзір Лебедзеў стаў потым першым сакратаром райкама партыі ў Бярозе. І хоць хлопец па заўсёднай сваёй сарамлівасці ўпіраўся, партыйны сакратар праяўляў настойлівасць, ён казаў звычайна: «Мы з табой, Сіма, разам ваявалі, разам і пашану прымаць павінны». Так і стаяў Сіма на трыбуне ў выхадным касцюме і паліто, купленых усё тым жа Лебедзевым. А калі Сямёну нарэшце выдзелілі асобны пакой, то мэблю і няхітры гаспадарчы набор збіралі знаёмыя, суседзі, сярод якіх былі бацькі Наталлі Кавалевіч.

Ціха і непрыкметна пражыў у Бярозе Сямён Бакштэйн, сведка трагедыі на Смалярцы. І больш чым праз паўстагоддзя ўвекавечылі памяць пра яго маці, што так адчайна ратавала сына.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *Бярозаўскі раён.*

---

Уражанні

# СВЯТА, АБ ЯКІМ НЕ МАРЫЛІ

**Наша вёска адзначала Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі, але размовы пра яго не сціхаюць і сёння. Напэўна таму, што вось такога «прасунутага» свята ў Лучыне дагэтуль ніколі не было!**

Ну па-першае, пачнём з таго, што рыхтаваліся да яго загадзя. На відэа здымалі і лепшых працаўнікоў (тых, хто вылучыўся яшчэ на сяўбе, потым на дажынках), і, скажам так, самародкаў. Вера Цярэнцьеўна Тамашкова, напрыклад, маці-гераіня — выгадавала пяцёра дзяцей, усё жыццё працавала цялятніцай, мае ўзнагароды. А яшчэ яна ў нас цудоўна вышывае — ручнікі, абрусы, набожнікі, навалкі... Хобі тэхнічкі Алены Анатольеўны Міронавай — маляванне, скульптура. Для свайго падворка, для дзіцячага садка яна нарабіла мядзведзікаў, ваўкоў, лісічак. Настаўніца Людміла Іванаўна Клімкова адрадзіла абрад «Троіца», і наш фальклорны калектыў паказваў яго не толькі ў сваёй гаспадарцы, але і ў раёне...

«Кіно» — ды пра сябе, пра сваіх землякоў — глядзець было вельмі цікава. Па-новаму выглядалі і знятыя на плёнку нашы мясціны, гучалі песні, уручаліся каштоўныя (ды яшчэ і якія!) падарункі лепшым механізатарам, лепшым жывёлаводам, спартсменам, нават дзецям, якія працавалі на дапрацоўцы зерня...

Карацей, пра нешта падобнае яшчэ два гады таму вяскоўцы не маглі і марыць, бо гаспадарка, некалі, дарэчы, вельмі моцная, была на каленях. Але прыйшоў новы кіраўнік і...

Хваліць яго, Андрэя Васільевіча Чарненку, не будзем, бо яшчэ крый бог ад нас забяруць, але ж падзякаваць яму, а таксама загадчыцы Дома культуры Надзеі Аляксееўне Борыкавай трэба — і за працу, і за свята. Успамінаў пра яго будзе, напэўна, да новага.

**Таццяна ЦАРАВА, бібліятэкарка,**
*в. Лучын. Рагачоўскі раён*

---

# «Мільён налева — мільён направа?..»

**Сёлета восенню Камітэтам дзяржкантролю Брэсцкай вобласці сумесна з Галоўным упраўленнем Міністэрства фінансаў Беларусі па Брэсцкай вобласці была праведзена комплексная праверка ў Баранавіцкім раёне. Правяралася выкананне заканадаўства ў сферы фінансавых і падатковых адносінаў, і не толькі.**

Камісія адзначыла некалькі істотных момантаў. У раёне назіраецца тэндэнцыя росту пратэрмінаванай запазычанасці па пазыках. Напрыклад, калі на пачатак 2007 года яна складала 4442,5 млн рублёў, то на верасень 2008 года сума вырасла ў два разы.

Кантралёры падкрэслілі, што нягледзячы на бюджэтную запазычанасць, некаторыя гаспадаркі раёна дазволілі сабе раскошу і набылі легкавыя аўтамашыны, прычым некаторыя —дзве ці нават тры.

У народзе ёсць прымаўкі: «Капейка рубель беражэ» ці «Курыца па зярнятку дзяўбе...», якія падкрэсліваюць, што без беражлівага стаўлення да кожнага рубля нельга марыць пра заможнае жыццё. Тысячы складваюцца ў мільёны, а тыя вырастаюць у мільярды, якія могуць быць з плюсам ці з мінусам. На першы погляд, парушэнні быццам бы і не значныя, а набягаюць сумы.

Адна справа, калі допушчаны некаторыя парушэнні з камандзіровачнымі расходамі, але калі ёсць завышэнне падрадчыкамі кошту выкананых работ, спісвання прадуктаў харчавання ці недахоп матэрыяльных каштоўнасцяў, то гэта расцэньваецца як сур'ёзныя парушэнні. У раённым аддзеле адукацыі такіх парушэнняў набралася на дзевяць мільёнаў.

У пасёлку Мірным Баранавіцкая ПМК-2 рамантавала мясцовы Дом культуры. Устаноўлена, што ў аддзеле культуры завышэнне кошту работ складае больш чым 15 млн рублёў.

Незаконна былі зрасходаваны грошы і ў сельгаскааператыве «Паланэчка». Тут цэлы букет парушэнняў: надбаўкі на закупачныя цэны, спісанне паліва і яго недахоп, завышэнне будаўнічых работ... вось і былі панесены страты ў памеры 14,7 млн рублёў.

Вышэй прыведзены самыя буйныя лічбы, шмат арганізацый і ўстаноў фігуруе ў справаздачы дзяржкантролю з меншымі сумамі.

Нават на незаконным адпусканні дзіцячага харчавання для малых, узрост якіх за два гады, набегла сума ў 3,6 млн рублёў.

Правяраючыя канцэнтравалі сваю ўвагу не толькі на фінансавых парушэннях, але і на праблемах вёскі.

Колькі ў нас гаварылася пра аказанне дапамогі насельніцтву пры апрацоўцы сельгаскультур на асабістых падсобных гаспадарках, нарыхтоўцы кармоў. У вобласці нават існуе «Праграма развіцця прыватных падсобных гаспадарак грамадзян Брэсцкай вобласці на 2006—2010 гады». І вось ужо прадугледжана стварыць роўныя ўмовы забеспячэння кармамі, аказання паслуг вяскоўцам, якія вядуць асабістыя падсобныя гаспадаркі. Калі не памыляюся, робіцца гэта не ўпершыню. Нават плануецца колькі грубых кармоў на карову (не менш за 2 тоны) павінен накасіць прыватнік на выдзеленым участку лугу.

У высокіх міністэрскіх кабінетах могуць планаваць (у добрых намерах) усё, што, здавалася б, павінна падтрымаць асабістыя гаспадаркі. Але ўсе гэтыя планы будзе выконваць старшыня сельгаскааператыва ці кіраўнік прадпрыемства. А ў яго сваё меркаванне наконт тых планаў. Кіраўнік СВК — чалавек прагматычны і ведае, што «галаву знясуць», калі на зямлі сельгаскааператыва не будзе своечасова сеяцца і жацца, а тое, што нехта там у вёсцы чакае каня, каб заараць свой агарод, то гэта справа дзясятая — за гэта ў раёне «часаць» не будуць, бо і там найперш думаюць пра грамадскае поле і статак.

І той факт, што прыватнікі ў краіне даюць амаль 90 працэнтаў бульбы, 82,5 працэнта гародніны, 20,3 працэнта малака... хвалюе далёка не ўсіх.

Для многіх старшыняў СВК мясцовы фермер, асабліва ўдачлівы — канкурэнт у плане гаспадарлівасці. Вось чаму важна, каб у поўным аб'ёме выконваліся мерапрыемствы рэгіянальных і дзяржаўных праграм. Якраз гэта і падкрэсліла камісія дзяржкантролю.

Падчас рэвізіі было ўстаноўлена таксама, што не вырашаны пытанні паляпшэння якасці бытавога абслугоўвання насельніцтва вёскі.

У раёне было запланавана за 2007—2008 гады стварыць 8 камунальна-бытавых структур, а стварылі толькі адну. Магчыма, не трэба было такія будаваць планы, а зыходзіць з рэальных магчымасцяў. Улічыўшы не толькі фінансавы бок, але і мэтазгоднасць тых структур.

Вяртаючыся да фінансавых парушэнняў, адзначу, што яны выяўлены ў дзяржаўным сектары — гэта там раскідваюцца народнымі грашыма, а дзе было бачна, каб прыватнік пераплаціў сваю тысячу? А вось прыхапіць сабе — гэта іншая справа.

Па выніках работы дзяржкантролю Баранавіцкім райвыканкамам былі зроблены адпаведныя высновы.

І пытанне тут не ў дысцыплінарных спагнаннях і адміністрацыйных штрафах, накладзеных на службовых асобаў, а ў тым, каб з новай рэвізіяй усё не паўтарылася.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

---

Крымінал

# Выдала сігналізацыя

**Такі від злачынства, як кватэрныя крадзяжы, на сёння не рэдкасць. Але вось выпадак, які здарыўся ў Гомелі, можна назваць унікальным.**

Два студэнты ПТВ вырашылі крышку падзарабіць: не прыдумалі нічога лепшага, як абрабаваць чужую кватэру. Напярэдадні маладыя людзі падрыхтаваліся як мае быць: прыхапілі з сабой нож, чыпы ад пад'езных дзвярэй, вялікую звязку ключоў ад кватэрных замкоў, на галаву надзелі цёмныя жаночыя калготкі. Хлопцы перарэзалі нажом тэлефонны кабель, але з-за нявопытнасці ці хвалявання, на сваё гора і на шчасце гаспадароў кватэры, не той, які планавалі...

Каля гадзіны дня 28 лістапада на пульт цэнтральнага назірання Савецкага аддзела аховы паступіў сігнал «Трывога». Ён сведчыў аб тым, што ў кватэры, якая знаходзілася пад аховай, адбылася аварыя на тэлефоннай лініі , — паведаміў **першы намеснік начальніка Гомельскага абласнога ўпраўлення аховы Аляксандр ЛІСІМАЎ.** — Праз чатыры хвіліны супрацоўнікі міліцыі прыбылі на месца «аварыі», дзе і затрымалі двух хлопцаў (адзін стаяў на варце, а другі ў гэты час спрабаваў узламаць замок). На студэнтаў, раней не судзімых, заведзена крымінальная справа.

**Надзея ДРЫЛА.**

# Далікатэс не прападзе

Памежнікі і кобрынскія міліцыянеры затрымалі ў в. Пецькі грамадзяніна Украіны, які на аўтамашыне нелегальна вёз больш за паўтары тоны цяляціны.

У любым выпадку далікатэс не прападзе.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Бясспрэчныя зацемкі

# НА НАШ ВЕК ХОПІЦЬ?!

**У кожнага чалавека свой погляд на жыццё. Аднаму хочацца верыць, што пасля яго нешта застанецца і людзі ўспомняць добрым словам, а другога гэта мала хвалюе: галоўнае — пражыць сённяшні дзень.**

Чыя кватэра прывязаная да жыллёвага кааператыва, той ведае, якая праблема бывае прыняць там нейкае рашэнне, асабліва калі трэба правесці сход жыльцоў і прагаласаваць.

Вось у 90-кватэрным доме неабходна адрамантаваць дах ці прывесці ў парадак пад'езды, як тут жа група жыльцоў заяўляе: «А на наш век хопіць!» І добра, калі іх менш за палову — рашэнне можна прыняць, а інакш усё застаецца ў падвешаным стане. Цікава, што ў сваіх кватэрах яны мяняюць вокны, дзверы, нешта фарбуюць і рамантуюць, а як справа даходзіць да ўсяго дома — тут жа вядомы аргумент. Думаю, што гэта самае папулярнае ў нас выказванне. Аднойчы гэтую фразу давялося пачуць тройчы за дзень і ад розных людзей.

Зразумела, што чалавек шкадуе грошай і падводзіць пад гэта апраўданне. Сапраўды, дацягнуць да смерці можна і з гнілымі рамамі ў пад'ездзе, але ж у гэтым доме пасля вас будуць жыць дзеці ці ўнукі, а калі дом у парадку, то і кватэру будзе лягчэй прадаць.

Далёка не ўсе прытрымліваюцца такой пазіцыі, але апанентаў па жыцці ў іх хапае.

Неяк паехаў да фермера — аднаго з лепшых у раёне. За некалькі кіламетраў ад фермерскай сядзібы растуць векавыя дрэвы. Тут некалі быў маёнтак, і гэтыя ліпы — усё, што ад яго засталося. У нас яшчэ часта можна бачыць купкі дрэў, якія напамінаюць пра велічную прыгажосць старадаўніх сядзіб.

Пад'ехалі да дома фермера, які стаіць пры полі. На даху — спадарожнікавыя «талеркі», за домам — гаспадарчыя будынкі і ніводнага дрэўца. Карціна даволі самотная, бо той дом у полі, як струп.

Вось і спытаў ў гаспадара, чалавека яшчэ маладога, наконт дрэў. Маўляў, вунь пан як стараўся ўпрыгожыць свой маёнтак. Тыя дрэвы і сёння да сябе прыцягваюць.

— А што ад іх карысці?

Я напомніў фермеру пра дзяцей і ўнукаў, якія з часам у яго будуць — жыццё ж на ім не канчаецца.

— Калі ім трэба будзе, то і пасадзяць, а мяне капуста корміць, — паказаў фермер на рады капусты, якія цягнуліся да небасхілу.

І што тут сказаць! Гаспадар добры і жыве заможна: новы джып і легкавушка пры доме — сведчанне гэтаму, але не пан. Усё ж апошні мысліў больш шырока. Дрэвы — гэта не толькі хараство паркаў і алеяў, але і сувязь пакаленняў.

А іншым разам бывае, што чалавек на старасці не толькі бярозы на мяжы, але і сад пілуе.

— Для каго пакідаць!

Але вернемся да фразы «На наш век хопіць», бо ў ёй закладзены глыбокі сэнс. Найперш, абыякавасць — галоўнае, не браць нічога да галавы. А яшчэ ёсць жаданне, няхай і падсвядомае, перакласці ўсе свае праблемы на будучае пакаленне — я дажыву, а вы там разбірайцеся.

Такая пазіцыя для грамадства шкодная, ад яе патыхае ўпадніцтвам. За некалькі гадоў можна высечы ўвесь лес — на наш век хопіць, а нашчадкі няхай пні карчуюць.

Чаму многія хаты аказаліся кінутымі і сёння нікому не патрэбныя? Ды таму, што яны даведзены «да ручкі». Нават дзеці тую хату не хочуць афармляць, бо нават каб мець бацькоўскую хату за дачу, неабходна ўкласці грошы. А ў свой час грошы ў бацькоў былі, але шкадавалі траціць на плот і дах, вось і дацягнулі да смерці. А грошы яшчэ раней ператварыліся ў прах.

Маёмасць, матэрыяльныя каштоўнасці заўсёды мелі перавагу перад грашыма.

Чалавек, які будуе дом (у прамым і пераносным сэнсе), заўсёды будзе ў выйгрышы і ён ніколі не скажа, што на яго век хопіць.

Ніхто не аспрэчвае, што з сабой у іншы свет нічога не возьмеш. Але і пазіцыя будыйскага манаха, які сузірае з гары свет, падманлівая — яго нехта ж корміць.

Прасцей кажучы, што мы сёння пасеем, тое нашы дзеці заўтра і сажнуць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Глядзіце!

## Кіно пра гонар і годнасць

У сталічным кінатэатры «Перамога» з 2 па 10 снежня пройдзе паказ мастацкіх і дакументальных фільмаў «Чалавечая годнасць, роўнасць, справядлівасць». Арганізаваны ён Прадстаўніцтвам ААН у Беларусі, офісам АБСЕ ў Мінску і Прадстаўніцтвам упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў пры садзейнічанні пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь.

У праграму паказу, які прымеркаваны да 60-годдзя прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, увайшлі знакамітыя карціны — прызёры самых прэстыжных кінафестываляў: фільмы «Праляртаючы над гняздом зязюлі», «Цудоўная краіна», «Завадны апельсін», «Хто ніколі не жыў», «Які бяжыць за ветрам», «У рукі незнаёмцаў», «Паўночны экспрэс». Уваход на ўсе фільмы вольны, аднак колькасць білетаў абмежаваная колькасцю месцаў у зале. Атрымаць білеты можна ў дзень паказу ў касах кінатэатра «Перамога», пачынаючы з 18.00.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## Ніякіх нарматываў наконт колькасці інвентарнай тары ў магазінах не існуе...

**«Ці ёсць нейкія стандарты на колькасць ячэек для захоўвання асабістых рэчаў і інвентарных кошыкаў у магазінах? Часта даводзіцца адстойваць чаргу спачатку для таго, каб пакласці ў ячэйку свае сумку ці пакет, потым яшчэ адну — за тым самым кошыкам. І гэта толькі да ўваходу ў гандлёвую залу! Пакупнікоў часам бывае шмат, асабліва пасля працоўнага дня, а работнікі магазіна не прымаюць ніякіх мераў: кошыкаў на ўсіх не хапае, частка ячэек — са зламанымі замкамі...»**

Гэта пытанне чытача мы пераадрасавалі спецыялістам упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю.

— Якіх-небудзь нарматыўных патрабаванняў да колькасці інвентарнай тары, ячэек для захоўвання асабістых рэчаў заканадаўствам не ўстаноўлена, — адказалі рэдакцыі. — Аднак калі такія ячэйкі занятыя, спажывец мае права знаходзіцца ў гандлёвай зале і з пакетамі, сумкамі і г.д. Правілы гандлю такой забароны не ўтрымліваюць.

Што да інвентарнай тары, дык пры продажы тавараў метадам самаабслугоўвання ў прадуктовых магазінах адбор пакупнікамі тавараў праводзіцца ў кошыкі, вазкі і іншыя падобныя сродкі, прызначаныя для транспарціроўкі тавараў у такіх магазінах самаабслугоўвання. Адабраныя пакупніком тавары павінны знаходзіцца ў інвентарнай тары да іх аплаты, сказалі нам у міністэрстве. Ну дык а калі гэтай самай тары няма, як заўважыў чытач?

— Адзінае, што застаецца пакупніку, гэта дачакацца, калі які-небудзь спажывец, разлічыўшыся, мінуе касу і вызваліць ад набытага тавару той самы інвентарны кошык, — адказалі спецыялісты ўпраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай. — Яшчэ ён можа пакінуць сваю прапанову аб павелічэнні колькасці інвентарнай тары, зрабіўшы запіс у Кнізе заўваг і прапаноў. Аднак канкрэтнае рашэнне па ёй будзе прымаць адміністрацыя, уладальнік магазіна. Паколькі, як мы ўжо сказалі, ніякіх нарматыўных патрабаванняў да колькасці інвентарнай тары няма, уладальнік можа палічыць, што яе — дастаткова (а пэўныя праблемы ўзнікаюць толькі ў «гадзіны пік»), і нічога не мяняць у гэтым накірунку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ведай нашых!

## «Дзіцячую Новую хвалю» выйграла беларуска

**Днямі ў Маскве прайшоў першы міжнародны конкурс маладых выканаўцаў папулярнай музыкі «Дзіцячая Новая хваля-2008».**



Удзел у ім бралі і беларусы — салістка ўзорнага тэатра-студыі эстраднага мастацтва «Каларыт» Крысціна Святлічная і Анатоль Ярмоленка-малодшы (на сцэне выступае як DJ Анатоль). Нягледзячы на такое сціплае прадстаўніцтва, беларуская дэлегацыя вярнулася дадому з узнагародамі — 8-гадовы Анатоль атрымаў прыз глядацкіх сімпатый, а 10-гадовая Крысціна заваявала галоўны прыз, Прэмію першай ступені!

Папярэдне на адрас аргкамітэта паступіла больш як 2000 заявак ад юных выканаўцаў як з Расіі, так і з краін блізкага і далёкага замежжа. На паўфінал у Маскву былі запрошаны 100 удзельнікаў, і толькі 18 з іх журы дапусціла да фінальнай часткі творчага спаборніцтва.

Абодва нашы выканаўцы выступалі ў малодшай узроставай катэгорыі конкурсу — ад 8 да 12 гадоў, дзе канкурэнцыю складалі яшчэ 8 удзельнікаў з Расіі, Украіны, Таджыкістана, Грузіі, Ізраіля, Германіі і Канады. У старэйшай узроставай групе, 13—15 гадоў, беларусаў не было — за перамогу спаборнічалі прадстаўнікі Расіі, Украіны, Казахстана, Літвы, Латвіі і Македоніі. У фінале конкурсу, які праходзіў 27 і 28 лістапада, удзельнікі выконвалі па 2 песні — з дзіцячых кінафільмаў ці мультфільмаў, а таксама арыгінальную кампазіцыю. Пасля першага конкурснага дня беларусы займалі 2-е (Крысціна) і 5-е (Анатоль) месцы ў сваёй узроставай групе, а вось на другі дзень Крысціна Святлічная ўжо лідзіравала, і ў выніку набрала 219 балаў і заняла першае месца. Другое месца заняў спявак з Таджыкістана Далі, на трэцім апынулася Дыяна-Марыя з Германіі.

Акрамя дыпломаў і падораных арганізатарамі прафесійных мікрафонаў, юныя артысты атрымалі спецпрызы. Так, Анатолю дастаўся падарунак ад кампаніі «Смаленскія брыльянты» — скрыпічны ключ, упрыгожаны брыльянтамі. Крысціна ж прывезла ў Мінск галоўны прыз — статуэтку з белага і чорнага хрусталю ў выглядзе трох хваляў і клавіш раяля. Да таго ж налета Крысціна запрошаная на «Новую хвалю» ў Юрмалу — праўда, пакуль што толькі ў якасці ганаровай госці.

Дарэчы, для Крысціны Святлічнай гэта далёка не першая перамога. Яна ўладальніца I прэміі міжнароднага фестывалю краін СНД і Балтыі 2005 года, Гран-пры фестывалю дзіцячай песні «Джурджэўдан-2007» (г. Баня-Лука, Боснія і Герцагавіна), спецыяльнага прыза Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі на дзіцячым конкурсе «Славянскага базару ў Віцебску-2007». Дзяўчынка паспяхова сумяшчае вучобу ў сталічнай гімназіі, заняткі ў эстраднай студыі Барыса Асмалоўскага «Каларыт», а таксама цалкам дарослую работу — напрыклад, яна ўдзельнічае ў пастаноўцы Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра «Прыгоды Брэменскіх музыкаў». А яшчэ марыць паступіць у Расійскую акадэмію тэатральнага мастацтва і абавязкова запісаць сольны альбом з 16 песень, нават ведае яго будучую назву: «Песня — гэта птушка».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## За заслугі — лепшым будаўнікам

**У краіне заснаваны нагрудны знак Саюза Будаўнікоў «За заслугі ў будаўніцтве».**

Ім могуць быць узнагароджаны работнікі арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў за заслугі ў галіне будаўніцтва, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і вялікі ўклад у развіццё будаўнічага комплексу, падрыхтоўку кадраў, навуковую і іншую дзейнасць, накіраваную на павышэнне эфектыўнасці будаўнічай вытворчасці. Да знака могуць быць прадстаўлены работнікі галіны, што маюць працоўныя заслугі, працяглы стаж работы і значныя вынікі ў працы і якія актыўна ўдзельнічаюць у дзейнасці Саюза.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




На слыху

## Ахоўнік-сутэнёр

40-гадовы гродзенец, які працуе ахоўнікам аднаго з турысцка-экскурсійных прыватных даччыных унітарных прадпрыемстваў, як высветлілася, «падзарабляў» на сутэнёрстве.

Як мяркуецца, падазроны з карыслівых мэтаў «курыраваў» дзвюх 26-гадовых непрацуючых жанчын. Апошнія сёлета са жніўня па кастрычнік «пад дахам» ахоўніка займаліся прастытуцыяй. Папярэднім расследаваннем УУС Гродзенскага аблвыканкама ў дачыненні да ахоўніка ўзбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Сіла слова

## «СУРОКІ, ЛЯЦІЦЕ ДА САРОКІ...»

У народзе лічылася, што можна сурочыць дзіця і міжволі. Вось чаму беларусы, калі хто-небудзь выказвае ў сувязі з чалавекам ці жывёлай сваё здзіўленне, заўсёды кажуць: «Соль табе ў вочы, галавешку ў зубы». Гэтай заўвагай яны думаюць засцерагчы таго, хто выклікаў падзіў, ад небяспечных вынікаў.

У М. Нікіфароўскага адносна гэтага напісана: «Самая распаўсюджаная і небяспечная дзіцячая хвароба — сурокі (урокі, гляды, зазехі) ад благога вока. Ёсць «акаяннікі зроду», адзін іх позірк на нейкую істоту, часта зусім нявінную, прыносіць ёй незлічоныя беды. Сурокі суправаджаюць ад калыскі да магілы не толькі чалавека, але і скаціну, птаства; найбольш пакутуюць ад сурокаў дзеці і жывёлы ў «дзяціным» узросце; жанчыны, калі ў іх месячныя, цяжарныя, «дзяцінахі» (якія кормяць грудзьмі), хлопцы і дзяўчаты надзвычайнай прыгажосці і маладыя, што бяруць шлюб, а таксама немачныя старыя. Сярод «акаяннікаў», якія часта і самі не ведаюць, што твораць, ёсць такія, што сурочаць толькі людзей або толькі жывёл; большасць жа іх сурочыць усё без разбору. Само сабою зразумела, што хваробы ад сурокаў не паддаюцца медыцынскаму лячэнню, а вылечваюцца толькі «бабамі», да якіх пакутнікі і звяртаюцца».

І бабкі-шаптухі стараліся: «Маць Прачыстая ішла, Ісуса Хрыста нясла. На сіне мора, на белы камень. Сцірала, змывала, рабу божаму (імя) помачы давала. Вячэрняй зарніцай, паўночнай зарой, ранішняй зарніцай, дзённай зарой, рабе божай (імя) помачы давала. Агнявыя, вадзяныя, ветраныя, калючыя, палючыя, свярбучыя, сурочныя, надумныя, прыгаворныя, бабскія, мужчынскія, хлапечыя, дзявочыя, дзяціныя, сто жыл, сто пажылак, упрашвала, умаляла Госпада Бога. Ранішняя зара тухла, каб гэтая боль утухла. Як Маць Прачыстая свайго сына прылюбіла, каб гэтая боль мой дух прылюбіла» (Дрыб. р-н).

У М. Нікіфароўскага знаходзім: «Перш чым лячыць ад сурокаў, трэба пераканацца, ці папраўду дзіця «сурочана» і ці няма іншых прычынаў хваробы. Дзеля гэтага дзіця трэба купаць у дажджавой ці рачной вадзе і ў ночвы кінуць тры халодныя вуглі: «у галавешкі, у сяродку, у ножкі. Калі вуглі пачнуць рухацца і сінець — дзіця сурочанае, а большая ці меншая ступень іх рухомасці і шыпення пакажа ступень «сурочанасці» (кожны асобны вугаль на тое месца, дзе пераважна сканцэнтраваныя сурокі). Калі вуглі спакойныя — смела можна сцвярджаць, што дзіця захварэла не ад сурокаў».

Амаль аналагічнае сцвярджаў А. Сержпутоўскі: «Сурокі — гэта такая хвароба, якая прыкідаецца, як на дзіця зірне той, у каго зроду ліхія вочы. Е такія паганыя вочы, што яны як толькі глянуць не то што на дзіця, але нават і на сталага чалавека, то зашкодзяць. Хоць бы яны глянулі так сабе, без жаднага ліхога замерку. Такія ліхія вочы шкодзяць вельмі ганебна дзецям ды малой жывёле. Урокі ці падзіў прыстае і к жанкам, як е ў іх на бялізне месячныя, як яны ў стане або як яны кормяць цыцкаю дзяцей. Апрыч таго, падзіў прыстае к гожым хлопцам і дзеўкам, к маладым на вяселлі і к нядошчым старым. Тыя паганыя людзі, што маюць такія вочы, і самі не ведаюць, што яны так шкадлівы; адны з іх шкодзяць толькі людзям. Другія — жывёлу, а е й такія пагані, што шкодзяць усяму, на што ні зірнуць. Ад урокаў ці падзіву не дапамагаюць жодныя лекі дохтураў, а трэба іх лячыць толькі дома рознымі прымхамі да прасіць тых баб, каторыя добра ўмеюць, як адхадзіць ад гэтае напасці».

Даволі часта такія шэпты маглі называцца і «Малітвамі , «Малітвамі ад зглазу», «Малітвамі ад сурокаў і чорных вачэй». «Первым разам, божым часам, Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся і ўсім прыпадобнічкам, божжым угоднічкам, кіеўскім і пячэрскім. Святыя прыпадобнічкі, божжыя угоднічкі, прыбягайце. Памагайце рабу божаму (імя скажы) ці малому балячку вымаўляці і ўрокі-прымоўкі. Як на моры, на камені стаяў дуб; пад тым дубам, на камені, сядзела дзеўка Лісавета. Яна шыла-вышывала, рабу божаму (імя скажы) балячку вымаўляла і ўрокі-прымоўкі: калючую, балючую, свярбучую, прымоўную, прыгаворную, падуманую, пагаданую, жаноцкую, парабоцкую, дзявоцкую, хлапецкую, бацькіну і маткіну, смешную, уцешную, завісную, радасную, карысную, начную, палуначную, дзённую, палудзённую, ветраную, вадзяную, часную і мінутную. Скула-скулішча, муравая-муравішча і ўрокі-прымоўкі, тут вам не хадзіць, крыві не паліць, жоўтай касці не ламіць. Скула-скулішча, муравая-муравішча і ўрокі-прымоўкі, выйдзіце вы з касцей, з палукасцей, з жыл і з паўжыл, з буйной галавы, з карых вачэй, з румянага ліца, з гарачае крыві і з шчырага сэрца.



Ідзіце вы ў чыстае поле, там вас ажыдаець, з віном, з гарэлкай сустракаець; там вас будуць угашчаці, пуховыя падушкі слаці, шоўкам краваці засцілаці. Вышэптваю, выгавараю з касцей, з палукасцей, з жыл і паўжыл, з буйной галавы, з карых вачэй, з румянага ліца, з гарачай крыві і з шчырага сэрца. Падуць і плюнуць тры разы». (Добр. р-н).

У П. Шэйна чытаем: «Напрыклад, пры лячэнні ад «сурокаў» маці распраналася да сарочкі і тры разы пераносіла грудное дзіця паміж сваім целам і сарочкай, пачынаючы ад падолу і каўняра. «Начніцы» часам лячылі так: налівалі ў гаршчок ваду з такога месца, адкуль яе ніхто не чэрпаў гады тры, даводзілі да кіпення, клалі туды нож, іголку, верацяно, накрывалі драўлянай міскай і ставілі гаршчок пад калыску, дзе ляжала дзіця, потым асцярожна пераварочвалі гаршчок. Калі вада хутка вылівалася ў міску, дзіця павінна было хутка вызваліцца ад «начніц». Нічога рацыянальнага не было і ў лячэнні «крыксаў», «сушчаў», «разачкі», «радзімца», «грызі на пупе», «валасення», «вогніка» і інш. Відаць, больш рацыянальна лячылі «дзіцячую жаўтуху»: рабілі адвар з бессмяротнікаў, купалі ў ім дзіця і крыху адвару давалі яму выпіць.

Праўда, замовы гэтага плана маглі называцца і крыху па-іншаму: «Падзіўкі», «Подзіўкі» і г.д., але сутнасць іх заключалася ўсё ў тым жа — пазбавіць дзяцей ад уздзеяння злых ( «завідушчых», зайздрослівых ) вачэй. Абавязкова адзначым, што замовы-шэпты «ад падзіўкі» лічыліся надзвычай моцнымі і выконваць іх маглі, а дакладней, ведалі словы і маглі імі вылечваць толькі самыя моцныя спагадлівыя знахаркі і варажбіты. «Падзіўкі мужчынскія, жаночыя, дзявочыя, хлапечыя, ідзіце, падзіўкі, у мохавае балота, ідзіце туды, дзе сонца не грэе, дзе вецер не вее, дзе людзі не бываюць. Як кустом не кусціцца, так на небе божым (імя) не відаць. Паўтараецца тройчы». (Акцябр. р-н.)

Як бачым, галоўную ролю ў магічным вылячэнні адыгрываюць не сродкі народнай медыцыны, а звычаі, якія стваралі вакол хворага своеасаблівы калектыўны настрой, што дазваляў знахару з дапамогай грамадскай свядомасці ўплываць на стан хворага чалавека. Гэта, па сутнасці, сацыяаморфная спроба вырашэння адвечнай прыроднай праблемы: у якасці фантастычнай мэты выступае не вылячэнне канкрэтнага хворага, а задавальненне родавых і эмацыянальных міфалагічных запатрабаванняў. Вядома, што патрыярхальныя людзі чакалі ад любога знахара не разгорнутага грунтавання саміх прычын хваробы і спосабаў яе больш поўнага вылячэння. Патрабавалася зусім іншае — аднаўленне, калі можна, дык самае падрабязнае, усіх дэталяў карціны, якая вядома толькі па адным рэальным элеменце — прысутнасць хворага. Гэты элемент трэба дапоўніць да цэласнага, завершанага вобраза — міфа, здольнага даць «задавальненне выдумкай», і пазбавіць усіх: і хворага, і ўсіх прысутных ад пакутлівага пачуцця неакрэсленасці, нявызначанасці і бяссілля. Адчай і страх павялічваліся асабліва тады, калі хварэлі-гарэлі не дарослыя, а дзеці. Разгледзім яшчэ адну групу замоў пры лячэнні дзяцей ад ліхаманкі, якая даволі часта падкідвалася ў малых. Таму што ім даводзілася паўсюдна дапамагаць дарослым: знаходзіцца пад дажджом, снегам, на марозе і ветры, разутымі і слаба апранутымі, бо даношвалася вопратка і абутак за старэйшымі.

М. Нікіфароўскі тлумачыў узнікненне ліхаманкі наступным чынам: «Увесну і ўвосень нельга спаць на заходзе сонца: тады найхутчэй у безабароннага чалавека заходзіць ліхаманка ці прыстае іншая ўнутраная хвароба. Часта здараецца, што, не паспеўшы па нейкай прычыне ўвайсці ў соннага, ліхаманка спяшаецца зрабіць гэта адразу пасля сну; прачнуўшыся, той выразна чуе, што яго завуць па імені, хоць і не бачыць таго, хто кліча: гэта кліча ліхаманка. Як толькі чалавек адгукнуўся, ліхаманка завалодвае ім. Таму прадбачлівы чалавек не павінен адгукацца, не пераканаўшыся, што яго кліча не прывід, а сапраўдны чалавек».

**Аляксей НЕНАДАВЕЦ.**
**(Працяг будзе.)**

Простая мова

# «Як сустрэну прыгожага...»

**Але перш...**

**Мінск, праспект, нейкі дом, прыступкі — дзяўчо на іх.**

**Дакладней — нават не яно, а... ногі. Ці нават не, не ногі — боты: чырвоныя, бліскучыя, а ўжо высозныя — халяўкі аж ПАД шорцікамі дзесь канчаюцца.**

**Ці ўсё ж такі НАД?..**

**Вачэй не адвесці...**

**І як простаму, сталаму люду, дык не зразумець: калі ў дзеўкі ёсць галава і хоць нешта апроч, навошта столькі ўвагі на ногі?**

### Парадокс

Добрая рэч — самаабслугоўванне: з кошыкам, з вазком між прылаўкаў прайшоўся і ўсё, што трэба ўзяў. Зручна — у Мінску большасць крам так гандлюе. Ці нават усе, дзе плошчы дазваляюць.

Тут — не, тут па старынцы пакуль:

— Мне палоўку хлеба, смятану, сыр, маянэз, — пералічваю прадавачцы, баючыся нешта забыць. — Ага, вяршкі яшчэ, масла...

Жанчына (праца ў яе такая) прывычна падае тавар, прабівае чэкі, нарэшце адлічвае рэшту. Пакуль хаваю яе у кашалёк, чую звернутае ўжо да іншага пакупніка:

— Вам што?

— Бутылку водки, — заказвае мужчына.

...Прасцей з імі — прынамсі, прадаўцам: нічога, лічы, не купляюць.

І, парадокс, неяк жывуць! Прычым, ндрэнна выглядаючы.

### Каму — няшмат...

Верына краса — каса.

Зрэшты, не, — касу яна, лічы, не сплятае. Часцей — даўжэзныя, густыя і чорныя, як смоль, валасы, звязвае ў шыкоўны хвост ці распускае па спіне... Нясе потым горда — як карону якую. Яшчэ б — такой прыгажосці ні ў каго няма...

Трэцяга дня яна яе ў цырульню занесла — хацела кончыкі падраўняць, з сантыметрык зрэзаць.

І цырульніца зрэзала... Хто ж яго мераў, колькі? Але дзяўчо пакрыўдзілася — дадому ледзь не з плачам прыйшло.

Маці давай супакойваць, казаць, што яно ж нічога страшнога, — вырастуць. Да таго ж:

— Як па-мойму, дык няшмат жа і не зрэзалі?

— Ага, табе няшмат, — румзала дзяўчына. — А я цяпер — ну як лысая!

Успрыманне... У кожнага сваё.

### Ёсць пытанне

Поп сваё, а чорт сваё: я яму пры кожнай сустрэчы, што трэба пісаць... Ён мне (і гэтак жа настойліва): «Не мая гэта справа. Я — мужык, звычайны вясковы мужык».

Трэцяга дня два лісткі перадаў са школьнага сшытка. На іх радкі:

*«Шэршэ ля фам, — казаў француз.*
*А ты, дурны, шукаеш грошы!»*

І яшчэ:

*«Кахай мяне, як я цябе*
*І шчасце прыйдзе ў нашу хату!».*

Мужык напісаў — звычайны, вясковы.

Ці ўсё ж — незвычайны?

### Толькі праўду!

— О-о, сколько лет, сколько зим?!.

Гэта — Таццяна (з дачушкай) насустрач. Ды з абдымкамі, з пацалункамі... Само сабой — з нейкімі пытаннямі і само сабой з гучным:

— Давай выйдем! Ну что мы — в автобусе разговаривать будем? Ведь не в деревне какой, — в Минске, в столице! И столько не виделись?!. Ну соглашайся («часу» вечно не будет!)... А так — кофейку где-то попьем, посидим...

— Какое посидим?! — даносіцца раптам аднекуль знізу. — Какой те кофеек, мама?.. Ты же сама говорила (прабачце. — **Аўт.**): «У нас такой срач дома, такой срач...».

Добра — дзверы якраз адчыніліся, — мы выскачылі: не ў кафэ, каб пагаманіць, дык хоць на вуліцу — пасмяяцца:

— Ну ты, дочь моя, сказанула! — на ўсю вуліцу шумела прыяцелька. — Ты хоть понимаешь, что ты сказала?

— Правду, — не міргнуўшы вочкам выдала малая...

Я навошта пра яе? Кажуць, вырасла, кажуць, школу заканчвае — хоча на журфак паступіць...

Цяжка прыйдзецца, калі паступіць.

Калі не паступіць — таксама.

### Смелыя

Сталіца. Спальны раён і зацішак — гэта значыць, той, каму на працу трэба, ужо прачнуўся і паехаў, той, каму не трэба, мусіць, спіць яшчэ, бо машыны па вуліцах гойсаюць, а вось людзей — мала: нафідавоку ўсе... А гэтыя і тым больш: ці то з учарашняга не праспаліся, ці то пахмяліліся ўжо — пад ручкі ідуць, парачкай і ўлукаткі. Высокія абое, худыя. Прычым ён — у нейкім доўгім зялёным плашчы, яна — у чырвоным спартыўным касцюме. Што ззаду выглядае, як... прыспушчаны сцяг.

Краіны, дзе (з улікам немаўлят і старых) на кожную душу насельніцтва ў год прыпадае па 12 літраў алкаголю.

Небяспечным, паводле Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, лічацца 5. Але ж мы — людзі смелыя, мы небяспек не баімся?

### Для каго?

Звыклае (ці амаль заўсёднае?): раніца, тралейбус, кніжка пад пахай. А вось месца, каб сесці чытаць, на жаль, нямашака. Позіркам вышукваю свабодны куток (каб хоць стаць зручней), і здалёк яшчэ бачу, якая ж там прыгажуня! Ну ўсё пры ёй — шыкоўны белы паўпальтак, прычоска, макіяж, а ўжо пазногці — «карціна маслам», на кожным...

Не хацела, — давялося іх разглядаць: дзяўчо мабільнік ля вушка трымала. Зноў жа не хацела, — прыйшлося слухаць размову, дакладней — дзявочыя (!) кароткія, як стрэл, каментары. Кшталту (прабачце!): «Во б.!», «Ну ты п.!..»

...Чытаць больш не хацелася.

Нешта пісаць — тым больш.

### Як сустрэну прыгожага...

Дзень народзінаў — дзень дарункаў. Сярод іх — духі. Што, зразумела ж, прыемна. Падзякавала... І, хоць карыстацца пакуль не збіралася (старых яшчэ ладнавата), адкрыла...

Не схлушу — пах, як пах — прыемны. Бутэлечка ж — ну проста цуд, твор мастацтва: пяшчотна ружовая, пузаценькая, з высокім стромкім горлачкам...

Не вытрымала — паставіла навідавоку (гэта значыць, на палічку перад люстэркам), проста, каб бачыць. А высветлілася — каб... карыстацца. Прычым, штодзень і... міжволі, бо рукі неяк самі па сабе цягнуцца не да паху (таго, праверанага часам, любімага), а да новага, прыгожага флакона.

...У Еўдакіі Лось ці не пра тое ж: «Як сустрэну прыгожага, думаю мілы?»

### «А пачынаюцца з яе...»

*Маленечкі, чаканы, мілы,*
*Ты з Дабравесня —*
*жыхарок зямлі!*
*Расці ж хутчэй і набірайся сілы*
*На ўцеху буслам, што цябе няслі!»*

Такімі слоўкамі, як зараз помню, мы віталі новага сямейнічка, хлопчыка, Міхася.

Зрэшты, імя ў яго тады не было. Як і многага іншага. Затое цяпер — мужычок ужо (чатыры з добрым хвастом) — нават прафесію выбраў. Сказаў нядаўна, што з гліны будзе «рознаю там прыгажосць вылепліваць і здаваць у крамы, каб людзі куплялі».

Але ж гэта (ці нешта іншае) будзе потым. Цяпер — ён грамаце вучыцца. Каб лягчэй было, кніжку нядаўна прыдбала «Аз+Букі» (Мінск, «Мастацкая літаратура», 2004). А ў ёй... Ну ацаніце:

*— Агу! — **А** голас падае.*
***А** — асаблівая павага,*
*А пачынаюцца з яе*
*Айчына,*
*Азбука,*
*Адвага,*
*Аловак, Аксаміт,*
*Адрына,*
*Арэлі, абажур,*
*Ажына,*
*Анёл, абабак,*
*Аратай.*

*Ты азбуку*
*Далей гартай!*
***Б***
*Бульба, бусел,*
*Белавежа,*
*Бацька Нёман з берагамі, —*
*Беларусі ўсёй бязмежжа*
*Белабог аберагае.*

*Ад абразы, ад хлусні*
*Бацькаўшчыну барані!*

І далей прыгожыя радочкі пра кожную з нашых (жывых яшчэ) літарак — вершы Рыгора Барадуліна, Васіля Віткі, Артура Вольскага, Міколы Маляўкі, «загадкавыя азбукі» ад Уладзіміра Мазго і Уладзіміра Мацвеенкі, лемантар Максіма Танка...

А гэта — ацаніце — Мікола Чарняўскі — азбука для панурых у скорагаворках і каламбурах. Пра літару М:

*Села Мурка на падмурку,*
*Не сагнаць з падмурка Мурку.*
*Грэецца ды муркае:*
*Змерзну без падмурка я...*
*Вочы жмурацца ў Муркі:*
*— Хто са мной згуляе ў жмуркі?..*

— Я! — ну зразумела ж закрычыць тут Міхась. І, пра Мурку, адразу вывучыць на памяць. Як і пра многае іншае. Калі не пра ўсё. Бо хораша ж, мудра, цікава!..

Чытала сама — запоем і па той бок ночы...

А потым — да ранку не спала: вусцішна было ад думкі, што ГЭТА (да таго ж ідзе...) МОЖА (свят-свят-свят!) нікому не спатрэбіцца.

### Сустракаюць па адзенні...

Хто папярэджаны, той узброены. Пашчасціла неяк: праходзячы паўз прылаўкі шматгектарнага рынку ў Ждановічах, зачапіліся за адзін — з жаночай бялізнай. Не, не тавар прывабіў, — надпіс на ім: «Все трусы 15 тысяч».

— Все? — на поўным сур'ёзе пацікавіўся мой спадарожнік.

— А вы что — читать не умеете? — з раздражненнем спытала гандлярка. — По-русски написано: «Все...»!

— Ну-у, калі ўсе, — пераглянуліся мы, — за 15 тысяч можна і ўзяць.

— Вы не поняли. Все — это в смысле каждые, — стала папраўляцца дзяўчына. — Здесь у всех такие цены.

Пахадзілі потым, прыглядзеліся: кошты — і сапраўды амаль аднолькавыя, асартымент — таксама. Прычым — не толькі трусоў...

Што спарадзіла досыць каштоўную выснову: на рынках (як вялікіх, так і малых) няма сэнсу марнаваць час і збіваць ногі, прыцэньвацца да тавару ва ўсіх гандляроў: за свае (умоўна) 15 тысяч патрэбнае можна смела купляць у трэцяга...

Да сантэхнікі вось прыглядаемся. Дакладней — прыглядаецца муж, я...

Па́ра наперадзе — гадоў 35. Яна — досыць прывабная, хораша апранутая і куды вышэйшая, ён — мякка кажучы, невялічкі, лысы, худы...

— Что — на полтора метра ванну ищете? — з падколкай пытае ў іх адзін з гандляроў, па-змоўніцку міргнуўшы сваёй напарніцы.

Мужчына прапускае запыт міма вушэй, шыбуе далей, жанчына — прымае, відаць, за чыстую манету, за жаданне дапамагчы і іх таму — спыняецца, даверліва, на поўным сур'ёзе пачынае расказваць, што яны ў Мінску дом пабудавалі, ванны пакой — 9 квадратных метраў. З акном... Душ-кабіну паставілі, а ванна просіцца вялікая, вуглавая — паўтара метра там мала будзе.

Гандляр, збянтэжаны (ці то гэтым даверам, ці то адказам) насуплена маўчыць, напарніца яго — таксама. Калі не лічыць... позірку. У якім, як здалося, змяшалася ўсё: цікавасць, павага, зайздрасць, здзіўленне, няёмкасць за няўдалую падколку, крыўда...

І, магчыма, нечаканае разуменне таго, што не з росту зыходзячы трэба выбіраць спадарожніка...

*Бабулі спявалі калісь:*
*Невялічкі мужык*
*Ды затулле маё —*
*Завалюся за яго, —*
*Не баюся нікаго!*

Толькі... Хто старэнькіх іх слухаў...

**Валянціна ДОЎНАР.**

# БЛІСКУЧЫ ПРЭСТЫЖ

Бадай, нідзе ў краіне няма такога культу на завушніцы, як у Давыд-Гарадку. А ў гэтым кутку Століншчыны перавагу аддаюць вялізным, формы паўмесяца, і, зразумела, з дарагога жоўтага металу. Іх называюць яшчэ «цыганскімі». Меркаванне, што сапраўдную гарадчанку можна пазнаць па завушніцах, мае стапрацэнтную дакладнасць. У якім бы кутку былога Саюза вы яе ні сустрэлі і тым больш на Брэстчыне. І гэта не адзнака колішняй ці цяперашняй раскошы, і нават не традыцыя. Гэта — непадуладная часу мода, пачатку якой ніхто дакладна не ведае. Носяць «цыганскія» завушніцы не толькі персоны старэйшага ўзросту. Кожная бабуля імкнецца пакінуць у спадчыну ўнучцы сімвал давыд-гарадоцкай жаноцкасці. Між гарадчанкамі існуе негалоснае спаборніцтва: хто ўладальнік самых вялікіх і самых цяжкіх упрыгажэнняў. Бясспрэчнае першынство ўпэўнена трымае Таццяна Бесан (на фотаздымку ў цэнтры). Гэта прызнаюць Лідзія Некрашэвіч і Святлана Кузняцова (на фотаздымках) і большасць гарадчанак, абліччы якіх немагчыма ўявіць без бліскучых паўмесяцаў.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**







Свой погляд

## 3 правам на гонар

**Як вернік-католік я пастаянна хаджу ў касцёл. І вельмі рады таму, што мы, беларусы, цяпер маем шчасце маліцца і ўдзельнічаць у літургіі на сваёй роднай мове, слухаць казанні, навуку па-беларуску. Шчаслівы і ад таго, што наш каталіцкі касцёл бярэ самы актыўны ўдзел у адраджэнні беларускай нацыянальнай культуры, народных традыцый...**

Лічу, што нашы ксяндзы заўсёды найперш дома павінны знаходзіць паразуменне і падтрымку (у тым ліку і матэрыяльную), што дзяржава павінна паспрыяць больш хуткаму пераходу на беларускую мову Гродзенскай духоўнай семінарыі...

Зазначу: мне досыць часта даводзіцца бываць за мяжою і чаго там толькі ні чуць! Кажуць, што Беларусь — гэта штучнае ўтварэнне, што палова яе зямель — не нашы, што мы не цярпелі пераследу ў часы царызму і сталінізму, што не ўдзельнічалі ў бітве пад Монтэ-Касіна... На вялікі жаль, мы слаба ведаем уласную гісторыю і часта не знаходзім адказу. Маўчанне гэта прымаецца так як і павінна прымацца — знакам згоды, згоды, якой насамрэч няма. Мы павінны ўзбройвацца ведамі і вучыцца ваяваць за сваё, адстойваць найвялікшы скарб, якім з'яўляецца наша матухна-зямля, наша гісторыя, нашы героі. Вельмі ўдзячны «Звяздзе» за артыкул пра святара-патрыёта Канстанціна Стэповіча (ён жа паэт Казімір Сваяк). Зазначу, што асобных артыкулаў варты і яго паплечнікі — ксёндз Адам Станкевіч ды іншыя. І нарэшце — вельмі хацелася б заўсёды бачыць Беларусь моцнаю, незалежнаю дзяржавай, дзе пануе здаровы маральны лад жыцця, дзе свецкая ўлада разам з духавенствам — праваслаўным, каталіцкім — па-сапраўднаму клапоціцца аб захаванні традыцыйных хрысціянскіх каштоўнасцяў...

**Юрый СЯНЬКО.**
*г. Мінск.*

# ПА КОНЯХ!

**У Магілёве прайшла Першая рэспубліканская выстава коннага спорту і конегадоўлі «Партнёр каня», якую арганізавала Беларуская федэрацыя коннага спорту.**

У новым Магілёўскім конным манежы, лепшым на сёння ў краіне цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па конным спорце, дэманстравалі і прадавалі ўсё, што мае дачыненне да коней: ад сучаснага пакрыцця для конна-спартыўных манежаў да коннай «парфумы» ў выглядзе, напрыклад, сагравальнага гелю.

Дастаткова было зазірнуць на адзін са стэндаў, каб зразумець, што конны спорт — гэта сапраўды дарагое хобі. Уся амуніцыя, нават дробязі — пальчаткі ды шпоры, каштуе вельмі прыстойных грошай.

— Самае неабходнае для пачатку заняткаў конных спортам — гэта шлем, хлыст і крагі, — расказвае намеснік дырэктара сталічнага ТДА «Белы конь» Таццяна Крук. — Яны каштуюць як мінімум 150 тысяч рублёў.

— Добрыя чаравікі з крагамі каштуюць каля 300 тысяч рублёў, а боты для конніка — каля паўмільёна, — паказвае свой тавар прадстаўнік фірмы «ФРА-МІЛ», якая пастаўляе сваю прадукцыю для коннага эскадрона Крамля.

На выставе былі адразу заўважныя мужчыны-цыгане, вялікія аматары коней. Яны гучна спрачаліся пра вартасці тавараў, а адзін ледзь данёс мех з пакупкамі да аўтастаянкі.

У краме маладая дзяўчына ў форме казачкі завяршыла прымерку прыгожага камбінезона для конніка, рашуча дастала грошы і заплаціла... за папону для каня больш за сто тысяч рублёў.

— Так, за такія грошы можна было б і сабе добрую абноўку набыць, — уздыхае Каця Міраеўская з бабруйскага клуба «Ярмак». — Але яшчэ больш хочацца зрабіць добрае для свайго каня. Мая Афрадыта — пяшчотны, ласкавы і вытанчаны конь.

Казакі з Бабруйска бралі ўдзел у выставе і парадзе коннікаў.

— Мы прыехалі на выставу з дзецьмі, — сказаў падхарунжы Бабруйскага райаддзела Беларускага казацтва Руслан Аліеў. — Трэба, каб іх не на вуліцу цягнула, а да добрай справы і традыцый нашых бацькоў. Коні — гэта ўзор высакароднасці, і трэба ў іх гэтаму вучыцца.

**На другую рэспубліканскую выставу «Партнёр каня» запрошана прынцэса Хая з ААЭ, якая з'яўляецца прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі коннага спорту.**

— Коні — гэта прыгожыя і добрыя жывёліны, — лічыць 9-гадовы Давід, які ўжо два гады ездзіць на кані.

На выставе былі стэнды, прысвечаныя іпатэрапіі: у Беларусі існуюць методыкі лячэння цяжкахворых дзяцей праз стасункі з канямі. Прычым лячэння паспяховага, калі ўдаецца дапамагчы хворым на цэрэбральны параліч і эпілепсію.

— Мне здаецца, што ўвогуле і для здаровых людзей конны спорт замяняе ўсе аэробікі і трэнажорныя залы, — лічыць удзельнік выставы Франц Жылка. — Таму што біяполе каня станоўча ўздзейнічае на чалавека. Гэта эмацыянальна-псіхалагічная разгрузка, у выніку якой знікае агрэсія. Таму я заклікаю ўсіх садзіцца на каня менавіта ў гэтым сэнсе!

Свае жывапісныя творы прадставіла на выставе магілёўская мастачка Алена Аверкіна. Яна працуе трэнерам па конным спорце і малюе коней.

— Як іх можна не любіць? — рытарычна пытаецца Алена, у якой усё жыццё звязана з коньмі. — Я люблю гэтых жывёлін за характар, за сілу і магутнасць, за прыгажосць і грацыёзнасць.

Ацаніць усе гэтыя якасці магіляўчане і госці выставы змаглі на спаборніцтве па канкуры і паказальных выступленнях спартсменаў.

Каб выгадаваць добрую спартыўную пару — каня і чалавека, трэба як мінімум 7 гадоў. Альбо ўсё жыццё. Дзеці ў Беларусі прыходзяць у конны спорт з 5-6 гадоў. Ва ўсіх абласцях краіны ёсць конна-спартыўныя школы. Развіваецца ўвогуле індустрыя конегадоўлі і коннага спорту пры падтрымцы дзяржавы.

— Мы выконваем пратакол даручэнняў Прэзідэнта, і ўжо ёсць поспехі, — расказаў журналістам выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі коннага спорту Генадзь Кяцко. — На Алімпіядзе ў Пекіне ў нас былі 3 удзельнікі. У нас ёсць свае рэзервы, і цяпер мы распрацоўваем праграму для ўдзелу ў конным трохбор'і на Алімпіядзе ў Лондане. У нас ёсць шанцы заняць высокае месца.

Удзельніца Пекінскай Алімпіяды Алена Целяпушкіна брала ўдзел у парадзе. Праўда, не на знакамітым Пасаце, які цяпер адпачывае пасля напружанага сезона, а на гордым Галіяфе. Алена разам з яшчэ адной магілёўскай спартсменкай Аляксандрай Глушаковай выязджалі на манеж пад звон шматлікіх медалёў на грудзях прыгожых вершніц. Яны атрымалі ад арганізатараў дыпломы і персанальныя камп'ютары ў падарунак.

— Як сказаў Бернард Шоу, у свеце ёсць дзве дасканаласці: жанчына і конь, — узгадаў Генадзь Кяцко. — А звышдасканаласць — гэта, напэўна, жанчына на кані.

Выстава «Партнёр каня» завяршылася аўкцыёнам маладых племянных коней. Ёсць коні, якія каштуюць па 3—5 мільёнаў долараў і болей. За коней, якія былі прададзены на аўкцыёне ў Магілёве, плацілі ад 3 да 60 мільёнаў рублёў. Арганізатары заявілі, што аўкцыён прайшоў паспяхова, тым больш што пакупнікам дадзена растэрміноўка па аплаце на 6 месяцаў.

Другую выставу «Партнёр каня» Беларуская федэрацыя коннага спорту планує правесці наступнай восенню ў Ратамцы, дзе да таго часу правядуць рэканструкцыю манежа.

— Мы афіцыйна запрасілі на выставу прынцэсу Хаю з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, якая з'яўляецца прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі коннага спорту, — паведаміў Генадзь Кяцко. — Яна пагадзілася прыехаць у Беларусь. На другой выставе мы зробім міжнародны турнір па конным трохбор'і. Таму што бачым: у Магілёве першы блін камяком не атрымаўся. І гэта ўсё для людзей.

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**


Маладая вершніца.

## ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

**ПАДУМАЙ І РАШЫ**

**М. Таль — У. Антошын (1957 год).**



Ход белых. Адшукайце выйгрыш за іх.

**Д. Гургенідзе.**



Белыя выйграюць ці робяць нічыю?

**ЗВЕРЫМ РАШЭННІ?**

Рашэнні заданняў конкурсу, змешчаных 1 лістапада.

Заданне № 17. 1. Фf7+ Kph6 2. Kpg8 g4 3. Фf6+ Kph5 4. Kp:h7 g3 5. Фf5+ Kph4 6. Kph6 g2 7. Фf4+ Kph3 8. Kpg5 e1Ф 9. Фg4+ Kph2 10. Фh5+ Kpg3 11. Фh4+ Kpf3 12. Фf4+ Kpe2 13. Kc1x.

Заданне № 18. 1. Cd4+ C:d4 2. f8Ф (2. b7? Cc5+ 3. Kp:a4 Лg3 і чорныя выйграюць) 2. ... Cc5+ 3. Ф:c5 Л:c5 4. b7 Л:c4 5. b8Ф Kb1+ 6. Ф:b1+ Kp:b1 — пат. 4. ... K:c4+ 5. Kpb4 (5. Kp:a4? Kb6 6. Kpb4 Лc2! 7. b8Ф Kd5+ 8. Kpa5 Лa2 9. Kpb5 Лb2 і чорныя выйграюць) 6. b8Ф! Лb6+ 7. Kp:a4! Kb2+ 8. Kpa3 Kc4+ 9. Kpa4 Л:b8 — пат.

**З ПАРТЫЙ МАЭСТРА**

Беларускія шахматысты адзначылі памяць заслужанага трэнера СССР А.П. Сакольскага (1908 — 2008 гг.) правядзеннем прадстаўнічага турніру і вочнага рэспубліканскага спаборніцтва па рашэнні шахматных кампазіцый. Заслугоўвае ўвагі і папулярызацыя творчай спадчыны майстра, удзельніка чатырох усесаюзных першынстваў і іншых буйных спаборніцтваў у Беларусі і былым СССР.

Наступны яго паядынак цікавы ўсімі стадыямі гульні.

*А. Сакольскі — А. Котаў*
(Масква, 1949 г.).
*Сіцыліянская абарона.*

1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. Cb5+ Kc6 4. 0-0 a6?! 5. C:c6 bc 6. d4 cd 7. Ф:d4 e5 8. Фd3 Kf6 9. Лd1 Ce7 10. Cg5 0-0 11. Kbd2 Фc7 12. Kc4 Лd8 13. Ke3 Ce6 14. c4! з пагрозай c5 14. ... Лab8 15. Фc2 Лb7 16. Лac1 Фb8 17. b3 h6 18. Ch4 g5 19. Cg3 Kd7 20. h4 f6 21. Ke1 Kc5 22. Kd3 Фa7 23. K:c5 Ф:c5 24. Фe2 Cf8 25. Фh5 Kph7 26. Kg4 Cg7 27. Ke3 a5 28. Фf3 a4 29. ba Лa8 30. Kf5 Cf8 31. Лb1 Лf7 32. a5! Белыя адцягваюць чорную туру ад абароны восьмай гарызанталі. 32. ... Л:a5 33. Лb8 d5 34. Фh5 d4 35. Лdb1 Лd7 36. K:h6! Кароткая, але пікантная камбінацыя. 36. ... C:h6 37. Лh8+! Kp:h8 38. Ф:h6+ Лh7 39. Ф:f6+ Лg7 40. Лb7 і чорныя здаліся.

Прыводзім яшчэ адну партыю — мініяцюру, згуляную А. Сакольскім, дзе выкарыстоўваецца дэбют, названы іменем самога Сакольскага.

*Сакольскі — Стругач*
*Першынство Беларусі (1958 г.)*

1. b4 e5 2. Cb2 f6 3. e4 C:b4 (гамбітны варыянт) 4. Cc4 Kc6 5. f4 ef 6. Kh6 Ke7 7. K:f4 Ka5 8. C:f6! Лf8 9. Kh5! K:c4 10. K:g7+ Kpf7 11. 0-0 Kpg8 12. Фh5 Л:f6 13. Л:f6 Kg6 14. Л:g6! hg 15. Ф:g6 Kph8 16. Ke8! Фe7 17. Kf6 і чорныя здаліся.

## «Кіно» з працягам

У Мазыры ў суд перададзены матэрыялы скандальнай справы аб відэаздымках пад назвай «Парнаграфія з першакласніцамі». Былы супрацоўнік кабельнага завода быў аўтарам забароненага кіно. Юных ахвяраў для недзіцячых фільмаў знаходзіла яго знаёмая. Аб інтрэсах 37-гадовага мужчыны не здагадваліся ні родзічы, ні суседзі.

У камп'ютары відэамана знайшлі больш за 10 аматарскіх парнаролікаў. Галоўныя гераіні — дзве мазырскія школьніцы 6 і 7 гадоў. Саўдзельніца заманьвала маленькіх актрыс са складаных сем'яў да сябе на кватэру, а «добры дзядзечка» здымаў іх за цацкі і шакаладкі. Адну з дзяўчынак нават вазілі на фотасесію ў лес. Акрамя таго, галоўны аператар выконваў яшчэ і ролю партнёра.

Як паведаміў старшы следчы пракуратуры Гомельскай вобласці Юрый Прыходзька, «дадзеную злачынную відэаарганізацыю арганізаваў жыхар Мазыра разам са сваёй палюбоўніцай з мэтай вырабу відэафільмаў для далейшага размяшчэння ў інтэрнэце. З іх слоў, каб зарабіць сродкі. Акрамя вырабу парнаграфічных здымак, яго дзеянні суправаджаліся сэксуальным гвалтам у адрас малалетніх. У адным выпадку ён здзейсніў гвалт сэксуальнага характару, у другім — згвалтаванне».

Памочніцы педафіла пагражае да 3 гадоў пазбаўлення волі, а рэжысёр, аператар і акцёр у адной асобе можа правесці за кратамі 15 гадоў. Між тым, мазырская міліцыя па фотаздымках з парнаролікаў працягвае пошук дзяўчынак, якія таксама маглі стаць ахвярамі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


Відэа, знятае абвінавачаным.

## «Аўдзі» ўдарылася ў дрэва

**Трагічна скончылася паездка для 44-гадовага вясковага жыхара з Пінскага раёна, аўтамабіль «Аўдзі» якога з'ехаў з дарогі і ўдарыўся ў дрэва.**

Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ў суботу паблізу вёскі Бобрыкі. У выніку 34-гадовая жонка вадзіцеля і 13-гадовая дачка загінулі на месцы здарэння, а другая дачка — васьмігадовая, і 30-гадовая аднавяскоўка атрымалі траўмы і былі змешчаны ў бальніцу. На жаль, урачам не ўдалося выратаваць апошнюю пацярпелую — жанчына праз некалькі гадзін памерла ў бальніцы.

**Кар. «Звязды».**

## «Сярэбраная» расіянка

**Сапраўды буйная партыя ўпрыгажэнняў канфіскавана ў 49-гадовай грамадзянкі Расіі, якая была затрыманая супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі АУСТ у Брэсце.**

У жанчыны было знойдзена... 25 тысяч 646 ювелірных вырабаў з серабра: ні адно з упрыгажэнняў не мела прабірнага кляйма Беларусі. Па факце праводзіцца далейшая праверка.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

## Сякера як прадмет запужвання?

**Не зразумець асобных мужчын стала апошнім часам. Як толькі ў іх узнікаюць нейкія непаразуменні з жанчынамі (сужыцелькамі, жонкамі), дык галоўнымі аргументамі ўхілення канфлікту з'яўляюцца пагрозы прымянення сякеры.**

Так было, напрыклад, у Рагачоўскім раёне. Там 25-гадовы жыхар з вёскі Зарэчча пагражаў прымяніць сякеру супраць 48-гадовай жанчыны з вёскі Курганне. З таго ж Зарэчча мужчына пагражаў забойствам (таксама сякерай) сваёй сужыцельцы з вёскі Дварэц. Жанчыны зрабілі адпаведныя заявы ў міліцыю. І тыя вымушаны былі зрабіць яўку з павіннай.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Зламыснікаў «вылічыў» сабака

У адну і тую ж ноч, праўда, у розны час, у дварах шматпавярховікаў Светлагорска раздаўся звон бітага шкла. Раніцай выявілася: пацярпелі дзве іншамаркі-легкавушкі — «Рэно-Лагуна» і «Мерседэс-Бенц». У іх былі разбіты шкло і люстэркі.

Калі б мясцовая міліцыя не мела магчымасці задзейнічаць для пошукаў зламыснікаў службовага сабаку, то, безумоўна, у яе работнікаў былі б цяжкасці. А так чатырохногі сябар хутка ўзяў след — і вось яны, шкоднікі. Адзін — 38-гадовы рабочы цэлюлозна-кардоннага камбіната, а другі — 24-гадовы малады чалавек, які нідзе не працуе. Дарэчы, абодва раней судзімыя. Мужыкі ўпарціцца не сталі. Бо ведалі: сабака ў падобных выпадках, як кажуць, не збрэша. Нікога ў зман не звядзе. Бо ён — службова-вышуковы.

А вось у Гомелі міліцыя абышлася без сабакі, калі ў двары Дворнікава лабавое шкло іншамаркі разбіў неаднаразова судзімы 1979 года нараджэння.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Пракурыў іншамарку?

Калі ў грамадзяніна нашай краіны на мытным пераходзе «Весялоўка» спыталі, ці не вязе ён забароненыя тавары, той бадзёра запэўніў: не. Гэта ж пацвердзіў і ў дэкларацыі. А мытны кантроль засведчыў: у патаемных месцах аўтамабіля было выяўлена ажно 800 пачкаў цыгарэт, закупленых ва Украіне. Тытунёвыя вырабы і «Мазда-323» былі канфіскаваныя ў даход дзяржавы, а парушальнік аштрафаваны на 40 базавых велічынь.

Нешта падобнае, але ў значна большых маштабах, здарылася і на пункце мытнага афармлення «Камарын». Двое грамадзян Азербайджана пераганялі «КамАЗы», якія былі зарэгістраваныя ў Расіі, ва Украіну. Дакументы на іх здаліся інспектару падробленымі, што ў час правядзення экспертызы пацвердзілася. Суд пастанавіў: грузавікі, кошт якіх складае амаль 300 мільёнаў рублёў, канфіскаваць у даход дзяржавы. Вадзіцелі аштрафаваны таксама на 40 базавых велічынь.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Прыхапілі выпіць і закусіць

**У в. Альсевічы Баранавіцкага раёна абрабавалі магазін — перапілавалі на вокнах рашоткі і залезлі.**

Выкралі, найперш, рыбныя і мясныя прадукты, а яшчэ прыхапілі гарэлкі, піва і цыгарэт. Прадавец жыве насупраць магазіна. Сігналізацыя не спрацавала, а можа, яе і няма.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## «Мінёр» трапіў у пастку

Гэтай вясной мы паведамлялі аб тым, што з Цэнтральнага рынку Гомеля давялося чатыры разы рабіць эвакуацыю тысяч людзей, бо ў праваахоўныя органы паступалі тэлефонныя званкі аб мініраванні. Не будзем гаварыць, колькі нерваў каштавала гэта людзям, колькі было зрасходавана грошай, каб весці пошукі тых мін і забяспечыць спакой і наведвальнікаў рынку, і тых, хто гандлюе на ім.

Аб'яднанымі сіламі міліцыі і чакістаў зламыснік быў выяўлены — 23-гадовы хлопец, які прадаваў на рынку музычныя дыскі, наняўшыся на працу да прадпрымальніка. У першы раз ён падбіў школьніка на званок у міліцыю, а калі таго затрымалі, высветлілася, што астатнія званкі рабіў сам падбухторшчык, мяняючы голас на дзіцячы.

Калі, як кажуць, у паветры запахла смажаным, хлопец пачаў афармляцца ў псіхіятрычную бальніцу на лячэнне, дзе яго і «ўзялі». На допытах ён выкручваўся, кожны раз мяняючы паказанні. Але гэта не дапамагло. Суд першай інстанцыі прыгаварыў зламысніка да пазбаўлення волі ў папраўча-працоўнай калоніі тэрмінам на тры з паловай гады.

Дзяржаўны абвінаваўца (прадстаўнік пракуратуры) лічыць меру пакарання занадта мяккай, а зламыснік — занадта жорсткай. Як бы там ні было, але тым, хто любіць гуляць у «мінёры», варта задумацца, чым могуць закончыцца іх жартачкі.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## *Бронзавы «Камандзіровачны» пасяліўся ў цэнтральнай гасцініцы Ліды*

**Скульптура «Камандзіровачны» ўстаноўлена ў Лідзе насупраць аднайменнай цэнтральнай гасцініцы.**

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў намеснік старшыні Лідскага раённага выканаўчага камітэта Антон Глаўніцкі.

Скульптура ў выглядзе чалавека, які сядзіць на чамадане з картай горада ў руках, выраблена з бронзы.

«Камандзіровачны» апрануты ў стылі 70-х гадоў мінулага стагоддзя, калі месца ў гасцініцы было дэфіцытам.

Аўтар твора — вядомы мінскі скульптар Уладзімір Жбанаў.

**БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

## Засталося толькі нараджаць

**У Пінску адчыніў дзверы радзільны дом, які паўтара года быў на рэканструкцыі.**

Усяго на абнаўленне раддома было патрачана 10 млрд рублёў, на 2 млрд закупілі сучаснага медыцынскага абсталявання. З мясцовага бюджэту было выдзелена 600 млн рублёў.

Цяпер «слова» за пінскімі жанчынамі, якіх чакаюць светлыя палаты і ветлівыя медыкі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**Спорт-тайм**

## Ковеля могуць адхіліць ад футбола

Палата па вырашэнні спрэчак ФІФА прызнала несапраўдным пераход беларускага футбаліста Леаніда Ковеля ў «Сатурн» і яго кантракт з расійскім клубам. Днямі львоўскія «Карпаты» атрымалі рашэнне палаты, у якім указана, што паміж «Карпатамі» і Ковелем існуюць кантрактныя абавязкі да 31 снежня 2011 года. Таксама ў дакуменце ўказана, што скаргу «Карпат» на мінскае «Дынама» разгледзіць Камітэт па статусу гульцоў ФІФА. Прэс-аташэ Расійскага футбольнага саюза Андрэй Маласолаў пракаментаваў магчымы вынік судовых разбораў па справе Ковеля. «Пазбаўляць «Сатурн» ачкоў ніхто не будзе. Хутчэй за ўсё, справа абмяжуецца вялікімі штрафнымі санкцыямі. Падмаскоўны клуб абавяжуць заплаціць «Карпатам», як гэта было ў выпадку, калі ў Дзіка Адваката аказалася два кантракты — з «Зенітам» і Федэрацыяй футбола Аўстраліі», — цытуе Масолава выданне «Спорт дзень за днём». У дачыненні да беларуса могуць быць прыменены больш сур'ёзныя меры. «Сатурн» мае права абскардзіць рашэнне ў Міжнародным арбітражным судзе ў Лазане. Калі падчас разбору высветліцца, што футбаліст уводзіў у зман работадаўцаў, то яго чакае дыскваліфікацыя тэрмінам ад чатырох месяцаў да года. Таксама можа быць пакараны і агент.

## «Дынама» прайграла «Металургу» па булітах

Мінскае «Дынама» ўпусціла перамогу ў матчы чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі супраць магнітагорскага «Металурга». Каманда саступала 0:1, затым вяла 3:1 і 4:2, але ў выніку прайграла па булітах 4:5. Асноўны час сустрэчы, якая прайшла 29 лістапада ў сталічным Палацы спорту, завяршыўся ўнічыю 4:4. У гаспадароў шайбы закінулі Сяргей Кукушкін, Андрэй Міхалёў, Аляксандр Кулакоў. Аляксандр Кулакоў не рэалізаваў буліт, не здолеўшы перайграць былога варатара беларускай зборнай Андрэя Мезіна, які замяніў маладога Ілью Праскуракова пасля трэцяй прапушчанай шайбы. Васіль Спірыдонаў пракаментаваў паядынак: «Усё прадвызначыў трэці прапушчаны гол у пачатку заключнага перыяду. Каб абгульваць такіх сапернікаў, як «Салават Юлаеў», «Магнітка», патрэбны дастатковы ўзровень майстэрства. Самалёт толькі выйшаў з піке, а мы адразу ж хочам усіх бамбіць». Пасля 30 гульняў «Дынама» з 26 ачкамі займае 22-е месца ў агульнай табліцы КХЛ і апошняе ў дывізіёне Баброва. Наступны матч мінчане правядуць дома 5 снежня супраць рыжскіх дынамаўцаў.

## «Юнацтва» закінула 100-ю шайбу

У чарговым туры Адкрытага чэмпіянату Беларусі па хакеі 29 лістапада лідар мінскае «Юнацтва» першым сярод 14 удзельнікаў дасягнуў мяжы ў 100 закінутых шайбаў, атрымаўшы перамогу ў гасцях над латвійскім «Агрэ» — 4:1.

Астатнія вынікі: «Металургс» (Ліепая) — «Хімвалакно» (Магілёў) — 4:2; «Віцебск» — «Металург» (Жлобін) — 2:0; «Хімік-СКА» (Навапалацк) — «Гомель» — 1:6; «Нёман» (Гродна) — «Латгале» (Даўгаўпілс) — 3:0; «Брэст» — «Рыга-2000» — 3:5.

Становішча камандаў: «Юнацтва» — 70 ачкоў (28 матчаў), «Гомель» — 63 (27), «Металург» — 55 (28), «Віцебск» — 49 (28), «Хімвалакно» — 49 (27), «Керамін» — 43 (24), «Хімік-СКА» — 42 (28), «Нёман» — 41 (27), «Металургс» — 41 (25), «Шыннік» — 27 (22), «Рыга-2000» — 26 (27), «Агрэ» — 20 (26), «Брэст» — 16 (26), «Латгале» — 13 (27).

## Аляксандр Гранькоў у «Шахцёры»

Першы дзень зімы прынёс першую кадравую навіну з салігорскага «Шахцёра». Падпісаны кантракт з паўабаронцам жодзінскага «Тарпеда» Аляксандрам Гранькоўым, які абараняў колеры салігорскай каманды ў 2004—2005 гадах. Згодна з інтэрнэт-апытаннем жодзінскіх балельшчыкаў, Гранькоў быў прызнаны лепшым гульцом «Тарпеда» ў сезоне-2008. У вышэйшай лізе чэмпіянатаў Беларусі паўабаронца правёў 165 матчаў, у якіх забіў 10 галоў і аддаў 25 выніковых перадач, паведамляе афіцыйны сайт клуба.

## *Бабруйск алімпійскі*

**Гэтымі днямі Бабруйск стаў эпіцэнтрам алімпійскага руху нашай краіны: тут прайшоў семінар Нацыянальнага алімпійскага камітэта.**

Першы віцэ-прэзідэнт НАКа, памочнік прэзідэнта па пытаннях спорту і фізічнай культуры Генадзь Аляксеенка зазначыў, што цяпер важна скіраваць развіццё спорту, у тым ліку і вялікіх дасягненняў, у раённыя цэнтры і, наогул, у глыбінку. Па-другое, Бабруйшчына заўсёды была кузняй для выхавання беларускіх алімпійцаў, што было пацверджана на летніх XXIX Алімпійскіх гульнях у Пекіне, дзе чэмпіёнамі ў веславанні на байдарках і каноэ сталі браты Багдановічы — Андрэй і Аляксандр.



Мэру Бабруйска Дзмітрыю Бонахаву было што паказаць. Як вялікая адметнасць — 50-метровы басейн з шасцю дарожкамі ў воднаспартыўным комплексе «Лясны», які знаходзіцца ў жывапісным прыродным комплексе. Паводле слоў дырэктара спартыўнай базы Віктара Дашкоўскага, толькі сёлета нацыянальная зборная краіны па плаванні правяла дзясятак паўнавыртасных збораў. Акрамя таго, тут трэніруюцца навучэнцы мясцовых спартыўных школ, вучылішча алімпійскага рэзерву, праяўляюць цікавасць да спартыўнага комплексу і замежныя спартсмены, якія таксама тут праводзілі зборы.

Яшчэ адным аб'ектам павышанай увагі стаў мясцовы стадыён «Спартак». Балельшчыкі са стажам адразу правядуць аналогію гэтай футбольнай Меккі з імем вядомага бабруйскага футбаліста Аляксандра Пракапенкі, які ў складзе мінскага «Дынама»-1982 стаў чэмпіёнам Савецкага Саюза... Дарэчы, побач са стадыёнам знаходзіцца аднайменны фізкультурна-аздараўленчы комплекс прафсаюзаў і помнік архітэктуры пачатку мінулага стагоддзя, дзе напярэдадні рэспубліканскага семінара ветліва расчыніла дзверы прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта — першае ў раённым цэнтры Беларусі, і музей алімпійскай славы.

Прадстаўніцтва НАКа ў Бабруйску ўзводзіць жылы дом, дзе ў хуткім часе навасёламі павінны стаць дзеючыя спартсмены-алімпійцы, трэнеры і спецыялісты. Вялікую цікавасць у прысутных выклікала выступленне міністра спорту і турызму Аляксандра Грыгарава, які зазначыў, што ў беларускіх спартсменаў яшчэ ёсць рэзерв, каб на наступнай Летняй алімпіядзе-2012 у Лондане перакрыць цяперашні вынік у 19 узнагарод. Зразумела, што словы міністра былі сугучнымі з «прапановай» кіраўніка нашай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі заваяваць на XXX Гульнях цэлых 25 алімпійскіх узнагарод. У рамках семінара прайшла акцыя «Алімпізм і моладзь» у выглядзе алімпійскіх урокаў. Дзецям уручылі вучэбныя падручнікі, распрацаваныя і выдадзеныя Беларускай алімпійскай акадэміяй з дапамогай грантаў Міжнароднага алімпійскага камітэта і «Алімпійскай салідарнасці».

Заключным акордам сустрэчы ў Бабруйску стала наведванне Лядовага палаца, разлічанага на 7 тысяч гледачоў. Прысутныя і госці семінара сталі сведкамі не толькі майстар-класа, які паказалі юныя хакеісты, але і адкрыцця Дошкі алімпійскай славы ў выглядзе алімпійскіх медалёў.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ,** *г. Бабруйск.*




**«НЕЗАЧАПЛЯЙКІ»**

Пры лоўлі спінінгам у «небяспечных» месцах — карчажніку, сярод камянёў і воднай расліннасці — многія рыбаловы выкарыстоўваюць розныя спосабы аховы кручкоў прынады ад зачэпаў. Але адразу ўзнікае пытанне: а дзе, акрамя такіх «моцных» месцаў, трымаецца і, адпаведна, бярэцца драпежная рыба? Бадай, калі не лічыць акунёў, якія жыруюць, і жэраха, іншых рыбаў спінінгісту даводзіцца шукаць менавіта ў такіх месцах. Кідаць блешню ў «чыстую» ваду часцей за ўсё азначае безвынікова згублены час. «А кідаць блешню з трыма кручкамі ў траву — выкідаць грошы на вецер!» — заўважыць чытач.



Дзе ж ісціна? Як адзін з асноўных і сапраўды сумных для рыбалова фактаў яна вынікае з усведамлення таго, што спінінгавыя прынады — расходны матэрыял. Прычым найбольш расходны з усяго рыбалоўнага арсеналу. Намаганні змяніць гэтую акалічнасць у спрыяльны для рыбалова бок выклікаюць вялікае сумненне. А чаму б тады не рабіць абсалютна ўсе прынады ў незачапляльных варыянтах? Але не, не робяць. Наадварот, у дадатак да стандартнага трайніка ў задняй частцы блешні, якая хістаецца, усё часцей падвешваюць яшчэ адзін трайнік і спераду, у раёне завадного кольца, а добрыя воблеры з трыма трайнікамі наогул хутка разбіраюцца.

«З дзясятак разоў бралася (стукала), але нічога не злавіў», — усё часцей можна чуць падобныя словы ад спінінгістаў рознага ўзроўню. Часам у якасці доказу паказваюць свінцовую галоўку з глыбокім следам ад клыкоў судака. Гэта ж трэба так абараніць кручок «ад зачэпу», каб потым пры такой магутнай хватцы драпежнік «збег» з прынады?! І як быць з асноўным правілам любога рыбалоўнага «буквара» («кручкі павінны быць ідэальна вострымі!»), калі мы самі спецыяльна закрываем жала кручкоў сіліконам, паралонам і г.д.?

Але самае сумнае і адначасова смешнае ў некаторым вопыце выкарыстоўвання незачапляльных прынад — гэта тое, што і рыбу не злавіў, і прынад гэтых адарваў усё роўна шмат. Таму што, як паказвае практыка, у большасці выпадкаў не кручок з'яўляецца прычынай «мёртвага зачэпу», а сама прынада захрасае паміж камянямі, у развілках карчоў і г.д. У такіх выпадках ні ахова кручкоў, ні самы моцны шнур не дапамогуць. З гэтым трэба проста змірыцца. Або прадаць спінінг.



**Практыка**

**ПАРАДЫ РЫБАЛОВУ-ПАЧАТКОЎЦУ**

**(Працяг. Пачатак у нумарах за 10 і 17 верасня.)**

**3-я: «Падлёдная лоўля»**

**1.** Для выхаду на лёд выбірайце ўчасткі, якія не пакрытыя снегам і размешчаныя на водмелях.

**2.** Па першым лёдзе не падыходзьце да трыснягу, асоту і карчакоў — там лёд заўсёды слабейшы.

**3.** У моцны мароз рыба, кінутая на лёд, хутка прамярзае і губляе свае смакавыя якасці. Вопытныя рыбаловы злоўленую рыбу складаюць у скрыню, у палатняную сумку.

**4.** Новую лунку трэба спачатку праверыць блешняй. Пры адсутнасці захадаў рыбы звычайна пераходзяць на лоўлю мармышкай.

**5.** Каб пешня ў дарозе не затупілася або, яшчэ горш, каго-небудзь не параніла, надзеньце на яе лязо кавалак тоўстага гумавага шланга.

**6.** У пачатку зімы рыба (плотка, акунь, шчупак) пазбягае цячэння, яе трэба шукаць на глыбокіх месцах. А вось у другой палове зімы, бліжэй да вясны, становішча на вадаёмах змяняецца. У гэты час рыбу ўжо варта шукаць у тых месцах, дзе ёсць цячэнне, хай нават слабае. У праточнай частцы больш кіслароду, а для рыбы гэта важна.

**7.** У выпадку слабай актыўнасці рыбы ўпартае сядзенне каля адной лункі поспеху звычайна не прыносіць. Дасведчаныя зімнікі калі рыба слаба бярэцца (звычайна гэта бывае ў глухую зімовую пару) лічаць, што колькасць злоўленай рыбы будзе залежаць ад колькасці прасвідраваных лунак.

**8.** Зімой, у глухую пару, калі актыўнасць рыбы слабее, найлепшы спосаб яе павялічыць — зменшыць памер мармышак.

**9.** Зімой мэтазгодна выкарыстоўваць блешні і мармышкі, у якіх кручкі са спілаванай бародкай, што дазваляе хутчэй зняць рыбу з кручка, не беручы яе ў рукі.

**10.** У яркі сонечны дзень лепш садзіцца каля лункі так, каб яе затуляў ваш цень. Калі ёсць магчымасць, лунку карысна прыцерушыць снегам.

**11.** У моцны мароз на лёсцы ўтворыцца наледзь. Яе варта чысціць, працягваючы паміж пальцамі. Наледзь робіць лёску тоўстай і яна прыглушвае захады рыбы.

**12.** Працоўныя ўласцівасці лёдабура залежаць ад вастрыні нажоў. Каб яны не тупіліся дачасна, карыстацца імі трэба асцярожна: не дапускаць удараў аб лёд, пры транспарціроўцы зачыняць адмыслова выраблены футлярам.

**Коратка**

**«ГІТАРА» ДЛЯ КАРАСЁЎ**

Гэтая снасць у нас вядомая як падхватнік для карасёў, падлёдная або сібірская «гітара». Яна чымсьці падобная на дзіцячы падхватнік для лоўлі матылёў, але памерам значна большая. Форма кольца нагадвае гітару, на якую мацуюць конусападобную сетку з конскага воласа.

Своеасаблівы падхватнік прыладжваюць да канца доўгага шаста. На яго насаджваюць вараток у выглядзе прапелера, які раскручваюць, каб стварыць у лунцы вір. Ён і ўцягвае рыбу ў падхватнік.

Лунак варта зрабіць дзясятка паўтара, каб намацаць месца, дзе збіраюцца карасі. А для гэтага патрабуецца вострая пешня.

**ЗІМОВЫ САДОК**

Звычайна рыбакі зімой кідаюць рыбу на лёд, і яна не проста замярзае, але і прамярзае. А значыцца, губляе свае смакавыя якасці. Каб захаваць рыбу, можна зрабіць так. Вазьміце звычайны поліэтыленавы мяшок, напоўніце яго вадой і пастаўце на снег. На дне і на сценках утворыцца тонкі пласт лёду, мяшок зможа стаяць, і рыба ў такім садку доўга захоўваецца жывой.

**Рыбацкі гаджэт**

**КУБАК СА ШЧУПАКА**

Доўгімі зімовымі вечарамі ды пад піва з рыбкай, гледзячы на свае летнія трафеі, раптам захацелася нешта стварыць... Не доўга думаючы ўзяў салёную, сушаную галаву шчупака, апрануў яе на падшклянак, развёў клей ПВА з прамакаткай, забіў пустэчы паміж



галавой і падшклянкам і на наступны дзень ужо піў піва, занюхваючы шчупаковай галавой. Вось зірніце, што атрымалася. Шклянка ўстаўляецца ў пашчу, заліваецца жаданай вадкасцю, пасля ўжывання яе ўнутр, вымаецца, мыецца і прыбіраецца ў сервант.

**Дзед Шчукар.**

## Прадукты для радасці

**Інфарм-укол**

**Вядома, што салодкае і асабліва шакалад, стымулююць выпрацоўку эндарфінаў, так званых гармонаў шчасця. Апошнія павышаюць настрой, але не з'яўляюцца самымі карыснымі.**

Пры стрэсе неабходна аднавіць дэфіцыт біялагічна актыўных рэчываў: вітамінаў і мікраэлементаў. У першую чаргу дапамогуць прадукты, якія ўтрымліваюць вітаміны групы B: мяса, малако, рыба, яйкі, грэчка, аўсянка, буры рыс, фасоля. Вітамін A і караціноіды таксама здольныя падняць тонус. Яны ёсць у пячонцы, жоўтых фруктах і гародніне. Палепшыць настрой і вітамін C, на які багаты салодкі перац, капуста, таматы, авакада, папая, ківі, цытрусавыя, зяленіва, чорная парэчка, шыпшына. Падчас стрэсу неабходны і селен — піўныя дрожджы, брокалі, часнок, морапрадукты. А вось ад харчовых стымулятараў, такіх, як кава і алкаголь, варта адмовіцца.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

